Более эффективному развитию сотрудничества белорусских парламентариев с их зарубежными коллегами способствуют соглашения о межпарламентском сотрудничестве, заключаемые Национальным собранием (его палатами) с законодательными органами иностранных государств.

Контрольные полномочия Парламента

Конституция Республики Беларусь наделяет Национальное собрание широким спектром форм и средств парламентского контроля за деятельностью исполнительной власти.

Согласно статье 97 Конституции Палата представителей дает согласие Президенту Республики Беларусь на назначение Премьер-министра, заслушивает доклад Премьер-министра о программе деятельности Правительства, одобряет или отклоняет программу. Палата представителей вправе рассмотреть по инициативе Премьер-министра вопрос о доверии Правительству, а также по инициативе не менее одной трети от своего полного состава выразить вотум недоверия Правительству.

Важной формой парламентского контроля является утверждение республиканского бюджета и отчета о его исполнении.

По согласованию с Президентом Республики Беларусь Палата представителей вправе также заслушивать информацию:

- Премьер-министра — о ходе выполнения одобренной Палатой представителей программы деятельности Правительства;
- Генерального прокурора — о состоянии законности в Республике Беларусь;

Bilateral international cooperation of the National Assembly is carried out within the framework of direct interaction with the representatives of foreign parliaments and other state bodies and with mediation of the diplomatic missions accredited in the Republic of Belarus.

Agreements on inter-parliamentary cooperation, concluded by the National Assembly (its houses) with foreign legislative bodies facilitate more effective cooperation of Belarusian MPs with their foreign colleagues.

Supervisory powers of the Parliament

The Constitution of the Republic of Belarus provides the National Assembly with a wide spectrum of forms and parliamentary instruments of monitoring the executive power.

According to Article 97 of the Constitution, the House of Representatives grants consent to the President of the Republic of Belarus concerning the appointment of the Prime Minister, considers the report of the Prime Minister on the policy of the Government and approves or rejects it.

The House of Representatives on the initiative of the Prime Minister has a right to consider a vote of confidence to the Government and also by no less than one-third of the full House of Representatives give a non-confidence vote to the Government.

An important form of parliamentary control is the approval of the Republican budget and the report on its execution.

By agreement with the President of the Republic of Belarus the House of Representatives also has the right to listen to:

- the Prime Minister about the status of the implementation of the Government program, approved by the House of Representatives;
- the Prosecutor-General about the state of law enforcement in the Republic of Belarus;
- the Chairperson of the Committee of State Control of the Republic of Belarus about the results of of state control, including the implementation of the Republican budget;

Кантроль парламентарыяў ажыццяўляецца таксама пры дапамозе пытанняў да Урада, зваротаў і запытаў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі. У сесійны перыяд запыты адрасуюцца Прэм'ер-міністру, членам Урада, кіраўнікам дзяржаўных органаў, якія ўтвараюцца або выбіраюцца Парламентам. Запыт уключаецца ў парадак дня сесіі, а адказ належыць даць на працягу дваццаці дзён ва ўстаноўленым парадку. Пісьмовы адказ на запыт абвяшчаецца на сесіі. Дэпутат Палаты прадстаўнікоў, член Савета Рэспублікі маюць права даць ацэнку адказу адпаведнай службовай асобы на запыт. Па выніках абмеркавання запыту і адказу на яго можа быць прынята пастанова палаты.

У адпаведнасці з часткай другой артыкула 103 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адно пасяджэнне ў месяц рэзервуецца для пытанняў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі і адказаў Урада. Пытанне можа быць унесена як у пісьмовай, так і ў вуснай форме. Пытанне ў пісьмовай форме загадзя перадаецца ў Сакратарыят адпаведнай палаты не пазней чым за сем дзён да дня правядзення гэтага пасяджэння. Старшыня палаты або яго намеснік накіроўваюць запрашэнні членам Урада з указаннем пытанняў, якія паступілі.

Кантроль за дзейнасцю Урада з боку парламентарыяў не абмяжоўваецца часовымі рамкамі сесій. У міжсесійны перыяд дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі актыўна выкарыстоўваюць такую форму кантролю, як зварот. Мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы, другія дзяржаўныя органы, органы грамадскіх аб'яднанняў, а таксама кіраўнікі іншых арганізацый, іншыя службовыя асобы, да якіх звяртаюцца дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі па пытаннях, што ўваходзяць у іх кампетэнцыю, абавязаны даць адказ у вуснай або па іх патрабаванню ў пісьмовай форме неадкладна, а пры неабходнасці дадатковага вывучэння або праверкі фактаў — не пазней чым у месячны тэрмін. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі маюць права прымаць непасрэдны ўдзел у разглядзе пастаўленых імі пытанняў.

- Председателя Комитета государственного контроля Республики Беларусь — о результатах осуществляемого в Республике Беларусь государственного контроля, в том числе за исполнением республиканского бюджета;
- Председателя Правления Национального банка — о ходе выполнения основных направлений денежно-кредитной политики на текущий год.

Контроль парламентариев осуществляется также посредством вопросов к Правительству, обращений и запросов депутатов Палаты представителей, членов Совета Республики. В сессионный период запросы адресуются Премьер-министру, членам Правительства, руководителям государственных органов, образуемых или избираемых Парламентом. Запрос включается в повестку дня сессии, а ответ надлежит дать в течение двадцати дней в установленном порядке. Письменный ответ на запрос оглашается на сессии. Депутат Палаты представителей, член Совета Республики вправе дать оценку ответу соответствующего должностного лица на запрос. По результатам обсуждения запроса и ответа на него может быть принято постановление палаты.

В соответствии с частью второй статьи 103 Конституции Республики Беларусь одно заседание в месяц резервируется для вопросов депутатов Палаты представителей и членов Совета Республики и ответов Правительства. Вопрос может быть внесен как в письменной, так и в устной форме. Вопрос в письменной форме заблаговременно передается в Секретариат соответствующей палаты не позднее чем за семь дней до дня проведения этого заседания. Председатель палаты или его заместитель направляют приглашения членам Правительства с указанием поступивших вопросов.

Контроль за деятельностью Правительства со стороны парламентариев не ограничивается временными рамками сессий. В межсессионный период депутаты Палаты представителей и члены Совета Республики активно используют такую форму контроля, как обращение. Местные Советы депутатов, исполнительные и распорядительные органы, другие государственные органы, органы общественных объединений, а также руководители иных организаций, иные долж-

- the Chairperson of the board of the National Bank about the status of the implementation of the principle directions of the monetary policy for the running year.

The deputies also exercise their supervisory powers by means of questions to the Government, addresses and inquiries of the deputies of the House of Representatives and the members of the Council of the Republic. During the session period inquires are addressed to the Prime Minister, members of the Government and heads of the state authorities, formed or elected by the Parliament. An inquiry is put on the agenda of the session and the answer should be given within twenty days in accordance with the established procedure. The answer to the inquiry is given in writing and announced at the session. A deputy of the House of Representatives and a member of the Council of the Republic have a right to evaluate the answer to an inquiry given by a corresponding official. Depending on the results of the inquiry and its answer, the house can take an appropriate decision.

Under Part 2 of Article 103 of the Constitution of the Republic of Belarus one sitting a month shall be reserved for the questions of deputies of the House of Representatives and members of the Council of the Republic to the Government. Question may be raised in writing or orally. A question in the written form is forwarded to the Secretariat of the appropriate house not later than seven days prior to the session. The Chairperson of the house or its substitute extends invitations to the members of the Government specifying the questions received.

Monitoring of the Government's activities on the part of the MPs is not limited by the calendar of sessions. During the inter-sessional period the deputies of the House of Representatives and the members of the Council of the Republic actively use such form of monitoring as an address. Local Councils of Deputies, the government and regulatory authorities, other state bodies, public organization, heads of organizations and other officials are obliged to answer without any delay orally or in writing any questions, falling within the competence of the deputies of the House of Representatives and the members of the Council of the Republic. If it is necessary to carry out further examination or verification of

Дадатковымі формамі парламенцкага кантролю з'яўляюцца таксама парламенцкія слуханні, дзейнасць пастаянных камісій палат Нацыянальнага сходу па асобных напрамках, а таксама магчымасць фарміравання пры неабходнасці часовых камісій Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі.

У мэтах ажыццяўлення кантролю за канстытуцыйнасцю нарматыўных прававых актаў у Рэспубліцы Беларусь Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі надзелены правам звароту ў Канстытуцыйны Суд.

Узаемадзеянне з органамі мясцовага самакіравання

Савет па ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з'яўляецца калегіяльным дарадчым органам, які ажыццяўляе распрацоўку прапаноў па ўдасканальванню дзейнасці органаў мясцовага самакіравання і каардынуе пытанні ўзаемадзеяння паміж імі і органамі дзяржаўнага кіравання.

Савет ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Палажэннем аб ім, зацверджаным 2 красавіка 2007 года Пастановай Савета Рэспублікі.

Асноўнымі задачамі Савета з'яўляюцца растлумачэнне і прапаганда дзяржаўнай палітыкі ў галіне мясцовага самакіравання, выпрацоўка рэкамендацый і прапаноў па фарміраванню і рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі пры ажыццяўленні мясцовага самакіравання, у тым ліку пры вызначэнні асноўных напрамкаў удасканалення заканадаўства ва ўказанай сферы, каардынацыя ўзаемадзеяння паміж Саветам Рэспублікі, органамі мясцовага самакіравання і органамі дзяржаўнага кіравання, садзейнічанне забеспячэнню збалансаванага падыходу да рэалізацыі дзяржаўных і мясцовых інтарэсаў пры распрацоўцы і ажыццяўленні сацыяльна-эканамічных праграм, а таксама павышэнню кваліфікацыі старшынь мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Адной з асноўных форм работы Савета з'яўляюцца пасяджэнні, якія праводзяцца, як правіла, з выездам у рэгіёны. Саветам таксама праводзяцца тэматычныя семінары, сустрэчы, у тым ліку ў фармаце «круглага стала», са старшынямі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Для вывучэння пытанняў, якія ўваходзяць у кампетэнцыю Савета, ствараюцца рабочыя групы пад кіраўніцтвам аднаго з яго членаў.

Значную ўвагу Савет удзяляе вывучэнню эфектыўнасці работы органаў мясцовай прадстаўнічай улады па паляпшэнню ўмоў жыцця людзей. Аналізуецца і абагульняецца практыка работы мясцовых Саветаў дэпутатаў па выкананню дзяржаўных праграм, якія датычацца сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторый, а таксама па іншых напрамках.

У адпаведнасці з артыкулам 28 Закона «Аб статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь» дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі маюць права ўдзельнічаць з правам дарадчага голасу ў пасяджэннях органаў мясцовага кіравання і самакіравання.

Взаимодействие с органами местного самоуправления

Совет по взаимодействию органов местного самоуправления при Совете Республики Национального собрания Республики Беларусь является коллегиальным совещательным органом, осуществляющим разработку предложений по совершенствованию деятельности органов местного самоуправления и координирующим вопросы взаимодействия между ними и органами государственного управления.

Совет осуществляет свою деятельность в соответствии с Положением о нем, утвержденным 2 апреля 2007 года Постановлением Совета Республики.

Основными задачами Совета являются разъяснение и пропаганда государственной политики в области местного самоуправления, выработка рекомендаций и предложений по формированию и реализации государственной политики при осуществлении местного самоуправления, в том числе при определении основных направлений совершенствования законодательства в указанной сфере, координация взаимодействия между Советом Республики, органами местного самоуправления и органами государственного управления, содействие обеспечению сбалансированного подхода к реализации государственных и местных интересов при разработке и осуществлении социально-экономических программ, а также повышению квалификации председателей местных Советов депутатов.

Одной из основных форм работы Совета являются заседания, которые проводятся, как правило, с выездом в регионы. Советом также проводятся тематические семинары, встречи, в том числе в формате «круглого стола», с председателями местных Советов депутатов. Для изучения вопросов, входящих в компетенцию Совета, создаются рабочие группы под руководством одного из его членов.

Значительное внимание Совет уделяет изучению эффективности работы органов местной представительной власти по улучшению условий жизни людей. Анализируется и обобщается практика работы местных Советов депутатов по выполнению государственных программ, касающихся социально-экономического развития территорий, а также по другим направлениям.

В соответствии со статьей 28 Закона «О статусе депутата Палаты представителей, члена Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь» депутаты Палаты представителей, члены Совета Республики вправе участвовать с правом совещательного голоса в заседаниях органов местного управления и самоуправления.

Interaction with local government institutions

The Council on interactions with local government institutions under the Council of the Republic of the National Assembly of the Republic of Belarus is a collegial consultative body that develops proposals on the improvement of the activities of local self-government institutions and coordinates interaction between them and state administration bodies.

The Council carries out its activities according to the Rules, ratified by the Regulation of the Council of the Republic of the National Assembly of the Republic of Belarus of April 2, 2007.

The main tasks of the Council are clarification and propaganda of the state policy in the field of local self-government, drawing up recommendations and proposals on the development and implementation of the state policy in local self-government and determination of the main directions of the improvement of the legislation of the Republic of Belarus in the above-noted sphere, coordination of the interaction between the Council of the Republic of the National Assembly of the Republic of Belarus, local self-government and state administration institutions, facilitating a balanced approach to the pursuit of state and local interests during the implementation of social and economic programmes and raising the qualification of the chairpersons of the local Council of Deputies.

One of the main forms of work of the Council is sessions which are held as a rule throughout the country. The Council also holds workshops, meetings, some of them in the form of a "round table", with the Chairpersons of the local Councils of Deputies. Working groups under the supervision of one of the members of the Council are formed to study the issues which are under the jurisdiction of the Council.

The Council pays significant attention to the efficiency of local representative authorities' activities on the improvement of the living conditions of people. The experience of the Local Councils of Deputies in the execution of state programmes concerning the social and economic development of territories and other issues is analyzed and summarized.

According to Article 28 of the Law of the Republic of Belarus "On the Status of a Deputy of the House of Representatives and a Member of the Council of the Republic of the National Assembly of the Republic of Belarus" deputies of the House of Representatives, members of the Council of the Republic take part in the sessions of the local government and self-government institutions with the right of a consultative vote.

some facts they are required to give an answer within a month. The deputies of the House of Representatives and the members of the Council of the Republic have a right to participate directly in the examination of the issues raised by them.

Extra forms of parliamentary monitoring are also parliamentary hearings, the activities of Standing Committees of the House of Representatives on particular issues and also a possibility of forming temporary committees of the House of Representatives and the Council of the Republic if required.

The House of Representatives and the Council of the Republic are authorized to apply to the Constitutional Court to control the constitutionality of legal acts in the Republic of Belarus.

ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ

Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

чацвёртага склікання

Біяграфічныя даведкі



АБАЛЕНСКІ
Яўгеній Вячаслававіч

Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву

Салігорская гарадская выбарчая акруга № 75

Нарадзіўся 30 сакавіка 1973 года ў горадзе Салігорску Мінскай вобласці. Закончыў Беларускую дзяржаўную політэхнічную акадэмію, інжынер-электрык; Маскоўскі дзяржаўны адкрыты ўніверсітэт па спецыяльнасці «Электразабеспячэнне горных прадпрыемстваў».

Працаваў электраслесарам па рамонту абсталявання, майстрам змены, намеснікам начальніка ўчастка пад'ёму № 2 чацвёртага рудаўпраўлення рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Вытворчае аб'яднанне «Беларускалій».



АДАШКЕВІЧ
Уладзімір Сцяпанавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі

Аршанская-Дняпроўская выбарчая акруга № 27

Нарадзіўся 11 лістапада 1949 года ў вёсцы Казлоўшчына Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны аграном; Мінскую вышэйшую партыйную школу; Акадэмію народнай гаспадаркі пры Урадзе Расійскай Федэрацыі па спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне». Кандыдат сацыялагічных навук.

Працоўную дзейнасць пачаў галоўным аграномам калгаса імя Куйбышава Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. Працаваў старшынёй калгасаў «Звязда», «Зара» Слаўгарадскага раёна, першым намеснікам старшыні Слаўгарадскага райвыканкама — старшынёй раённага аграпрамысловага аб'яднання. Быў намеснікам загадчыка аддзела сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці Магілёўскага абкама КПБ, першым сакратаром Касцюковіцкага райкама КПБ. Займаў пасады старшыні Касцюковіцкага раённага Савета дэпутатаў, першага намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама — старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню, намесніка дырэктара па інфармацыйна-выхаваўчай рабоце Магілёўскага аўтамабільнага завода імя С.М.Кірава, старшыні Аршанскага райвыканкама Віцебскай вобласці.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.

Старшыня Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і ліквідацыі наступстваў аварый.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, ордэнам Рускай праваслаўнай царквы Святога роўнаапостальнага Вялікага князя Уладзіміра.



АНДРАЙЧУК
Мікалай Канстанцінавіч

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаннях

Белавежская выбарчая акруга № 8

Нарадзіўся 7 красавіка 1957 года ў вёсцы Падбела Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Калінінградскі дзяржаўны ўніверсітэт, юрыст.

Працоўную дзейнасць пачаў токарам на Калінінградскім заводзе гандлёвага машынабудавання. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў следчым, старшым следчым Камянецкага раённага аддзела ўнутраных спраў. Быў народным суддзёй, старшынёй суда Камянецкага раёна.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па прававых пытаннях.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



АНДРЭЙЧАНКА
Уладзімір Паўлавіч

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Глыбоцкая выбарчая акруга № 22

Нарадзіўся 2 студзеня 1949 года ў вёсцы Мар'янава Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Велікалуцкі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны аграном; Мінскую вышэйшую партыйную школу, палітолаг. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў аграномам калгаса «Перамога сацыялізму» Верхнядзвінскага раёна, старшым аграномам Лёзненскай райсельгастэхнікі. Быў інструктарам, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Лёзненскага райкама ЛКСМБ, інструктарам Лёзненскага райкама КПБ. Працаваў сакратаром парткама саўгаса «Адаменкі», старшынёй калгаса імя Данукалава Лёзненскага раёна. Займаў пасады старшыні Лёзненскага райвыканкама, першага сакратара Верхнядзвінскага райкама КПБ, намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама. На працягу чатырнаццаці гадоў працаваў старшынёй Віцебскага аблвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага, другога і трэцяга скліканняў.

Першы намеснік Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, член Бюро Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, член Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, член Савета Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Мае дзве падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені, «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, ордэнам Беларускай праваслаўнай царквы Крыжа прападобнай Ефрасінні Полацкай.



АНІШЧУК
Ганна Тарасаўна

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу

Брэсцкая-Усходняя выбарчая акруга № 3

Нарадзілася 8 студзеня 1957 года ў сяле Млынава Ратнаўскага раёна Валынскай вобласці, Украіна. Закончыла Кіеўскі дзяржаўны педагагічны інстытут, настаўнік гісторыі, грамадазнаўства.

Працоўную дзейнасць пачала настаўніцай гісторыі Канышчанскай васьмігадовай школы ва Украіне. Працавала настаўніцай гісторыі Выдранцкай сярэдняй школы, загадчыкам музея ў сяле Картэлісы Ратнаўскага раёна, старшым навуковым супрацоўнікам навукова-экспазіцыйнага аддзела мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Была настаўнікам гісторыі, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце, дырэктарам сярэдняй школы № 11 горада Брэста. Займала пасаду дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 6 г. Брэста імя Маршала Савецкага Саюза Жукава Г.К.».

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.



АНТОНАВА
Іна Васільеўна

Член Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў

Наваполацкая выбарчая акруга № 25

Нарадзілася 23 ліпеня 1952 года ў горадзе Туле, РСФСР. Закончыла Паўночна-Асецінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа».

Працавала школьным урачом, загадчыкам аддзялення здаровага дзяцінства, галоўным урачом Наваполацкай дзіцячай паліклінікі. Займала пасады намесніка галоўнага ўрача па дзяцінству Наваполацкага гарадскога тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання, галоўнага ўрача дзіцячай паліклінікі ўстановы аховы здароўя «Наваполацкая цэнтральная гарадская бальніца».

З'яўлялася дэпутатам Наваполацкага гарадскога Савета дэпутатаў, Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў дваццаць чацвёртага і дваццаць пятага скліканняў.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя.

Арганізавала ў горадзе Наваполацку цэнтр рэабілітацыі для дзяцей-інвалідаў і цэнтр добразычлівых адносін да падлеткаў «Дыялог», была яго кіраўніком.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



АНТОНЕНКА
Аляксандр Ільіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы

Гродзенская-Занёманская выбарчая акруга № 49

Нарадзіўся 2 кастрычніка 1953 года ў горадзе Слаўгарадзе Магілёўскай вобласці. Закончыў Ленінградскі фінансава-эканамічны інстытут імя М.А.Вазнясенскага, эканаміст; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне нацыянальнай эканомікай».

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў майстрам, старшым майстрам механазборачнага ўчастка, начальнікам аддзела працы і заработнай платы Гродзенскага вытворчага аб'яднання па выпуску тэхналагічнай аснасткі. Быў інструктарам прамыслова-транспартнага аддзела Гродзенскага гаркама КПБ, інструктарам аддзела лёгкай прамысловасці і тавараў народнага спажывання, кансультантам сацыяльна-эканамічнага аддзела Гродзенскага абкама КПБ. Працаваў начальнікам інспекцыі дзяржаўнага падатковага камітэта па гораду Гродна, намеснікам начальніка і начальнікам інспекцыі дзяржаўнага падатковага камітэта па Гродзенскай вобласці, начальнікам аддзела Гродзенскага абласнога ўпраўлення акцыянернага ашчаднага банка «Беларусбанк». Займаў пасады загадчыка фінансавага аддзела, старшыні Гродзенскага гарвыканкама.

Намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па бюджэту і фінансах.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



АРЦЮШЭНКА
Яўгеній Антонавіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці

Мазырская выбарчая акруга № 42

Нарадзіўся 2 жніўня 1974 года ў горадзе Мазыры Гомельскай вобласці. Закончыў Гомельскі кааператыўны інстытут, эканаміст-арганізатар; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання.

Працоўную дзейнасць пачаў намеснікам дырэктара па фінансах таварыства з абмежаванай адказнасцю «Бертрам» у горадзе Гомелі. Працаваў эканамістам, намеснікам начальніка і начальнікам кантрольна-аналітычнага аддзела, начальнікам аддзела эканамічнага аналізу, намеснікам генеральнага дырэктара па эканоміцы і фінансах адкрытага акцыянернага таварыства «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод».

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па бюджэту і фінансах.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



АСМАЛОЎСКАЯ
Таццяна Сяргееўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі

Горацкая выбарчая акруга № 81

Нарадзілася 11 мая 1958 года ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці. Закончыла Беларускую ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, эканаміст — арганізатар сельскагаспадарчай вытворчасці; Мінскі інстытут кіравання пры Беларускім аграрна-тэхнічным універсітэце, менеджар-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачала арганізатарам экскурсійнага бюро горада Горкі. Была метадыстам дзіцячай турыстычнай базы Горацкага гарадскога аддзела народнай адукацыі. Працавала галоўным дыспетчарам, намеснікам старшыні калгаса «Сацыялістычны шлях» Крычаўскага раёна, намеснікам дырэктара па вытворчасці племсаўгаса імя Чкалава Горацкага раёна. Займала пасаду намесніка дырэктара па вытворчасці рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Вучэбная гаспадарка Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі».

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па сацыяльнай палітыцы і правах чалавека.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



АЎЧЫННІКАЎ
Віктар Васільевіч

Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі

Віцебская-Чкалаўская выбарчая акруга № 18

Нарадзіўся 8 кастрычніка 1952 года ў гарадскім пасёлку Бешанковічы Віцебскай вобласці. Закончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа».

Працоўную дзейнасць пачаў урачом-інтэрнам 2-й гарадской бальніцы горада Віцебска. Працаваў урачом Капыскай бальніцы, урачом-хірургам Аршанскай цэнтральнай раённай бальніцы. Быў урачом па экстраннай хірургіі, загадчыкам хірургічнага аддзялення тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання № 3 Першамайскага раёна горада Віцебска. Займаў пасады галоўнага хірурга ўпраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама, галоўнага ўрача ўстановы аховы здароўя «Віцебская абласная клінічная бальніца».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Паўночным саветам.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



БАГАТКА
Іван Мікалаевіч

Член Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню

Стаўбцоўская выбарчая акруга № 77

Нарадзіўся 9 кастрычніка 1950 года ў вёсцы Цвіркі Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, філолаг.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў літаратурным супрацоўнікам, рэдактарам стаўбцоўскай раённай газеты «Прамень». Быў інструктарам, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Стаўбцоўскага райкама ЛКСМБ, інструктарам арганізацыйнага аддзела Стаўбцоўскага райкама КПБ, другім і першым сакратаром Стаўбцоўскага райкама ЛКСМБ, загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі Стаўбцоўскага райкама КПБ. Займаў пасады намесніка старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама, рэдактара дзяржаўнай установы «Рэдакцыя газеты «Прамень» і праграмы радыёвяшчання «Радыё «Стоўбцы».

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



БАГДАНОВІЧ
Ларыса Мікалаеўна

Член Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў

Брэсцкая-Цэнтральная выбарчая акруга № 2

Нарадзілася 13 верасня 1958 года ў вёсцы Далкі Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-педыятр.

Працоўную дзейнасць пачала ўрачом-інтэрнам па педыятрыі Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы. Працавала ўрачом-педыятрам Брэсцкай абласной дзіцячай бальніцы, урачом-неўрапатолагам Брэсцкага тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання № 2. Займала пасаду галоўнага ўрача дзяржаўнай установы «Брэсцкі абласны цэнтр медыцынскай рэабілітацыі для дзяцей з псіханеўралагічнымі захворваннямі «Тонус».

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па сацыяльнай палітыцы.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



БАЙКОЎ
Васіль Міхайлавіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту

Віцебская сельская выбарчая акруга № 21

Нарадзіўся 28 мая 1953 года ў вёсцы Камаровічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, аграном-арганізатар. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працоўную дзейнасць пачаў брыгадзірам саўгаса «Камаровічы» Петрыкаўскага раёна. Працаваў галоўным аграномам саўгаса «Віцебскі», сакратаром парткама, дырэктарам саўгаса імя У.П.Краева Віцебскага раёна. Займаў пасады старшыні Віцебскага раённага Савета народных дэпутатаў, старшыні Віцебскага райвыканкама, намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама. Быў старшынёй Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Старшыня Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па вывучэнню вопыту дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



БАТАН
Уладзімір Іванавіч

Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву

Жлобінская выбарчая акруга № 40

Нарадзіўся 28 студзеня 1961 года ў вёсцы Мардзвін Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, інжынер-механік.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працоўную дзейнасць пачаў галоўным інжынерам калгаса «Шлях Леніна» Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. Працаваў начальнікам змены, майстрам па рамонту кранавага абсталявання і металаканструкцый, старшым майстрам, начальнікам цэха рамонту металургічнага абсталявання рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі металургічны завод» у горадзе Жлобіне.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Паўночным саветам.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



БЕЛКІНА
Тамара Аляксееўна

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД

Крычаўская выбарчая акруга № 83

Нарадзілася 14 кастрычніка 1952 года ў горадзе Магілёве. Закончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А.Куляшова, настаўнік рускай мовы і літаратуры.

Працоўную дзейнасць пачала старшай піянерважатай сярэдняй школы № 4 горада Магілёва. Працавала карэспандэнтам чавускай раённай газеты «Іскра», сакратаром камітэта камсамола Магілёўскага будаўнічага тэхнікума, галоўным рэдактарам гарадской светлавой газеты «Вячэрні Магілёў». Займала пасады галоўнага інспектара па Магілёўскай вобласці Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, начальніка галоўнага ўпраўлення міжпарламенцкіх сувязей Сакратарыята Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі ў горадзе Маскве, першага сакратара Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі ў горадзе Краснадары. Была галоўным саветнікам старшыні Мінскага аблвыканкама, начальнікам аддзела па ідэалагічнай рабоце дзяржаўнай установы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы.



БЕЛЯЕЎ
Аляксандр Арсенавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі

Гомельская-Сельмашаўская выбарчая акруга № 32

Нарадзіўся 12 красавіка 1947 года ў горадзе Ленінградзе, РСФСР. Закончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, эканаміст. Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працоўную дзейнасць пачаў рабочым будаўнічага трэста № 10 у горадзе Гомелі. Быў майстрам, прарабам, старшым прарабам будаўнічага трэста № 14. Працаваў начальнікам Гомельскага мантажнага ўпраўлення № 1 трэста «Тэхмантаж», начальнікам будаўнічага ўпраўлення № 45, галоўным інжынерам — першым намеснікам генеральнага дырэктара вытворчага будаўніча-мантажнага аб'яднання «Гомельпрамбуд», старшынёй праўлення вытворча-будаўнічага кааператыва «Трэст № 14». Займаў пасады першага намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама, старшыні Гомельскага гарвыканкама.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па гандлёвай палітыцы і міжнароднаму супрацоўніцтву.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», юбілейным медалём «60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».



БІРУКОВА
Марыя Міхайлаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД

Шчучынская выбарчая акруга № 60

Нарадзілася 2 чэрвеня 1949 года ў вёсцы Лашавічы Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Я.Купалы, настаўнік пачатковых класаў; Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС па спецыяльнасці «Вышэйшая партыйна-палітычная адукацыя».

Працоўную дзейнасць пачала загадчыкам Вялікасельскай бібліятэкі Свіслацкага раёна. Працавала настаўніцай Карэвіцкай і Ятвескай васьмігадовых школ, Сакольніцкай сярэдняй школы Свіслацкага раёна. Была загадчыкам аддзела прапаганды і культурна-масавай работы, другім сакратаром Свіслацкага райкама ЛКСМБ, сакратаром, другім і першым сакратаром Гродзенскага абкама ЛКСМБ, сакратаром ЦК ЛКСМБ, сакратаром Гродзенскага абкама КПБ. Займала пасады загадчыка аддзела, начальніка ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы, намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па палітычных пытаннях і міжнароднаму супрацоўніцтву.

Мае дзве падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана ордэнамі «Знак Пашаны», Францыска Скарыны, адзінаццаццю юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дзвюма ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.



БОГУШ
Піліп Піліпавіч

Член Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях

Навагрудская выбарчая акруга № 57

Нарадзіўся 1 студзеня 1952 года ў вёсцы Жухавічы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, ветэрынарны ўрач.

Працоўную дзейнасць пачаў паляводам калгаса «Перамога» Карэліцкага раёна. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў ветэрынарным урачом калгаса «Перамога», галоўным ветэрынарным урачом, намеснікам старшыні калгаса імя Жалезняковіча Карэліцкага раёна. Быў дырэктарам рэспубліканскага сельскагаспадарчага ўнітарнага прадпрыемства «Племзавод «Карэлічы».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



БУСЬКО
Віталій Леанідавіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД (2008 – 2011),
намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па міжнародных справах і сувязях з СНД (з 2011)

Усходняя выбарчая акруга № 107

Нарадзіўся 7 жніўня 1956 года ў вёсцы Лядкі Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Мінскі радыётэхнічны інстытут, інжынер-электрык. Кандыдат тэхнічных навук, дацэнт. Аўтар больш як 90 навуковых і вучэбна-метадычных прац.

Працоўную дзейнасць пачаў малодшым навуковым супрацоўнікам Мінскага радыётэхнічнага інстытута. Працаваў намеснікам старшыні і старшынёй прафсаюзнага камітэта студэнтаў, навуковым супрацоўнікам, дацэнтам кафедры вылічальных метадаў і праграмавання, дэканам факультэта радыётэхнікі і электронікі, намеснікам дэкана і дэканам факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання, прарэктарам па вучэбнай рабоце ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі».

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па мытнаму рэгуляванню і пагранічнай палітыцы.

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ВАНЬКОВІЧ
Анатоль Сцяпанавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы

Баранавіцкая-Заходняя выбарчая акруга № 5

Нарадзіўся 13 лістапада 1958 года ў вёсцы Ціхань Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Вільнюскае вышэйшае камандное вучылішча радыёэлектронікі проціпаветранай абароны па спецыяльнасці «Камандная, тактычная, аўтаматызаваныя сістэмы кіравання»; Ваенную камандную Чырванасцяжную акадэмію проціпаветранай абароны імя Маршала Савецкага Саюза Г.К.Жукава па спецыяльнасці «Камандна-штабная і аператыўна-тактычная войскаў проціпаветранай абароны»; Акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі па спецыяльнасці «Ваеннае і дзяржаўнае кіраванне». Генерал-маёр.

Праходзіў ваенную службу ў якасці камандзіра ўзвода, роты, батальёна, брыгады, начальніка аператыўнага ўпраўлення. Займаў пасаду камандуючага войскамі Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны. Быў начальнікам Галоўнага штаба — першым намеснікам камандуючага ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.

Старшыня Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па бяспецы, абароне і барацьбе са злачыннасцю.

Узнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме» III ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За бездакорную службу» I, II, III ступені, юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ВАСІЛЕНКА
Уладзімір Мікалаевіч

Член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы (2008 – 2010),
намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы (з 2010)

Магілёўская-Ленінская выбарчая акруга № 84

Нарадзіўся 10 лістапада 1963 года ў вёсцы Гіраўцы Чавускага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Магілёўскі тэхналагічны інстытут, інжынер-механік; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, эканаміст-менеджар.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў майстрам змены цэха аміячна-халадзільна-кампрэсарных установак, сакратаром камітэта камсамола круцільна-выцяжной вытворчасці, намеснікам сакратара камітэта камсамола Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно». Быў памочнікам начальніка вытворчасці сінтэтычнага валакна, начальнікам аддзела па мабілізацыйнай рабоце адкрытага акцыянернага таварыства «Магілёўхімвалакно».

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па пытаннях абароны і бяспекі.

Узнагароджаны медалём «За адвагу» (СССР) і іншымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.



ВЕРШАЛОВІЧ
Ларыса Георгіеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі
па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню

Лунінецкая выбарчая акруга № 13

Нарадзілася 1 красавіка 1956 года ў вёсцы Лясок Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа».

Працоўную дзейнасць пачала рабочай Беліцкай хлебапякарні Лідскага райспажыўсаюза. Працавала ўрачом-інтэрнам Баранавіцкай гарадской бальніцы, участковым тэрапеўтам, загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення, загадчыкам Лунінецкай раённай паліклінікі. Займала пасаду намесніка галоўнага ўрача па амбулаторна-паліклінічнай рабоце Лунінецкага раённага тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Паўночным саветам.

Узнагароджана юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



ВЫСОЦКІ
Алякcандр Мікалаевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў

Аўтазаводская выбарчая акруга № 92

Нарадзіўся 27 чэрвеня 1953 года ў горадзе Мінску. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст; Мінскую вышэйшую партыйную школу па спецыяльнасці «Вышэйшая партыйна-палітычная адукацыя».

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працоўную дзейнасць пачаў кінамеханікам у кінатэатры «Вымпел» горада Мінска. Працаваў слесарам, інжынерам-тэхнолагам, майстрам, сакратаром парткама аўтапрычэпнай вытворчасці, намеснікам дырэктара аўтапрычэпнай вытворчасці па матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню, намеснікам начальніка ўпраўлення кадраў рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскі аўтамабільны завод». Займаў пасаду старшыні пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскі аўтамабільны завод» Беларускага прафесійнага саюза работнікаў прамысловасці.

Член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па сацыяльна-эканамічных і прававых пытаннях.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ВЯЛІЧКА
Алег Іванавіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі

Брэсцкая-Заходняя выбарчая акруга № 1

Нарадзіўся 6 сакавіка 1959 года ў вёсцы Масевічы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа».

Працоўную дзейнасць пачаў урачом-інтэрнам па хірургіі Брэсцкай гарадской бальніцы. Працаваў урачом-траўматолагам, урачом-хірургам, галоўным урачом паліклінікі № 1 горада Брэста. Займаў пасаду галоўнага ўрача Брэсцкай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — старшынёй Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях.

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «90 год на варце граніцы», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалямі «Дрэва жыцця» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава), Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



ГАРБАЧОНАК
Мікалай Нікандравіч

Член Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці

Гродзенская сельская выбарчая акруга № 52

Нарадзіўся 12 снежня 1971 года ў вёсцы Балбекі Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы, выкладчык матэматыкі, інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў настаўнікам матэматыкі Абухаўскай сярэдняй школы Гродзенскага раёна, першым сакратаром Гродзенскага раённага камітэта Беларускага патрыятычнага саюза моладзі, першым сакратаром Гродзенскага раённага камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.



ГЛАЗ
Анатолій Ціханавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі

Бабруйская сельская выбарчая акруга № 80

Нарадзіўся 8 лістапада 1951 года ў вёсцы Калацічы Глускага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны аграном-эканаміст; Мінскую вышэйшую партыйную школу па спецыяльнасці «Партыйнае і савецкае будаўніцтва». Кандыдат эканамічных навук, дацэнт.

Працоўную дзейнасць пачаў галоўным аграномам калгаса імя Чапаева Глускага раёна. Быў другім і першым сакратаром Глускага райкама ЛКСМБ, другім і першым сакратаром Магілёўскага абкама ЛКСМБ. Працаваў старшынёй выканкама Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў працоўных, першым сакратаром Бялыніцкага райкама КПБ, старшынёй Бялыніцкага раённага Савета народных дэпутатаў, намеснікам генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях вытворчага аб'яднання «Бабруйскмэбля». Займаў пасады старшыні Бабруйскага райвыканкама, намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама.

Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны, медалямі «За працоўную доблесць», «За ратную доблесць», знакамі «За асабісты ўклад у развіццё культуры» і «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», ордэнам Рускай праваслаўнай царквы Святога цэсарэвіча Дзмітрыя.



ГОЛУБЕВА
Таццяна Генадзьеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі

Смаргонская выбарчая акруга № 59

Нарадзілася 27 чэрвеня 1947 года ў горадзе Крычаве Магілёўскай вобласці. Закончыла Белгародскі тэхналагічны інстытут будаўнічых матэрыялаў імя І.А.Грышманава, інжынер-хімік-тэхнолаг; Акадэмію народнай гаспадаркі пры Савеце Міністраў СССР, вядучы спецыяліст па кіраванню. Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачала лабарантам на Крычаўскім цэментна-шыферным камбінаце. Працавала электразваршчыкам на Гродзенскім камбінаце будматэрыялаў, інжынерам-тэхнолагам, намеснікам начальніка цэха Смаргонскага камбіната сілікатабетонных вырабаў. Была сакратаром партыйнай арганізацыі, генеральным дырэктарам вытворчага аб'яднання «Смаргоньсілікатабетон». Займала пасады намесніка Міністра прамысловасці будаўнічых матэрыялаў БССР, намесніка Міністра архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па бюджэту і фінансах.

Першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ГРЫЦКЕВІЧ
Генадзь Паўлавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту

Віцебская-Горкаўская выбарчая акруга № 17

Нарадзіўся 22 красавіка 1954 года ў вёсцы Паўазер'е Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер-будаўнік.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў інжынерам, начальнікам вытворча-тэхнічнага аддзела, галоўным інжынерам рамонтна-будаўнічага ўпраўлення Віцебскага гарадскога вытворчага аб'яднання жыллёва-камунальнай гаспадаркі. З'яўляўся галоўным інжынерам жыллёвага рамонтна-эксплуатацыйнага трэста Кастрычніцкага раёна горада Віцебска, намеснікам дырэктара гарадскога вытворчага аб'яднання жыллёва-камунальнай гаспадаркі, начальнікам упраўлення па ўліку і размеркаванню жылой плошчы, намеснікам старшыні Віцебскага гарвыканкама. Займаў пасаду старшыні Віцебскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны трыма юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ГУМІНСКІ
Віктар Аляксандравіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы (2008–2010), намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (з 2010)

Барысаўская гарадская выбарчая акруга № 62

Нарадзіўся 3 жніўня 1955 года ў вёсцы Свадбічы Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Новасібірскае вышэйшае ваенна-палітычнае агульнавайсковае вучылішча, афіцэр-палітработнік з вышэйшай адукацыяй; Ваенна-палітычную акадэмію імя К.Готвальда (ЧССР) па вышэйшай ваенна-палітычнай спецыяльнасці; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст. Палкоўнік.

Праходзіў ваенную службу ў якасці намесніка камандзіра роты, батальёна, палка, намесніка начальніка палітаддзела танкавай дывізіі, намесніка камандзіра танкавай дывізіі, начальніка аддзела 7-й танкавай арміі, начальніка аддзела 65-га армейскага корпуса, намесніка камандзіра па выхаваўчай рабоце 65-га армейскага корпуса Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання, трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы.

Кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалямі «За бездакорную службу» I, II, III ступені, дзевятнаццаццю іншымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ГУР'ЯНАЎ
Васіль Паўлавіч

Член Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях

Барысаўская сельская выбарчая акруга № 63

Нарадзіўся 26 снежня 1955 года ў гарадскім пасёлку Івянец Валожынскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Адэскі тэхналагічны інстытут харчовай прамысловасці, інжынер-механік-канструктар.

Працаваў начальнікам вытворча-тэхнічнага аддзела, намеснікам дырэктара Барысаўскага камбіната хлебапрадуктаў. Быў дырэктарам Барысаўскага трэста сталовых і рэстаранаў, дырэктарам вытворча-камерцыйнага прадпрыемства грамадскага харчавання «Барысаў», намеснікам дырэктара ўнітарнага прадпрыемства «Барысаўскі камбінат хлебапрадуктаў». Займаў пасады дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Лошніцкі камбікормавы завод», генеральнага дырэктара рэспубліканскага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Барысаўхлебпрам».

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ДАВЫДЗЬКА
Генадзь Браніслававіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі

Свіслацкая выбарчая акруга № 94

Нарадзіўся 29 верасня 1955 года ў гарадскім пасёлку Сянно Віцебскай вобласці. Закончыў Далёкаўсходні педагагічны інстытут мастацтваў, акцёр драматычнага тэатра і кіно; Беларускую акадэмію мастацтваў, рэжысёр драмы. Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў артыстам Арэнбургскага абласнога драматычнага тэатра імя М.Горкага. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл быў артыстам Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В.І.Дуніна-Марцінкевіча. Працаваў артыстам, генеральным дырэктарам дзяржаўнай установы «Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы» ў горадзе Мінску.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Быў старшынёй асацыяцыі грамадскіх аб'яднанняў «Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў».

Старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь са снежня 2010 года. Старшыня савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва, старшыня Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад».

Старшыня Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па інфармацыйнай палітыцы.

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.



ДАШКЕВІЧ
Георгій Віктаравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню

Хойніцкая выбарчая акруга № 47

Нарадзіўся 1 студзеня 1946 года ў горадзе Ельску Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, інжынер-электрык; Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў токарам саўгаса «Ельскі». Працаваў інжынерам-электрыкам, пасля службы ў радах Узброеных Сіл — тэхнолагам ельскага раённага аб'яднання «Сельгастэхніка». Быў начальнікам электрычных сетак Ельскага раёна, намеснікам старшыні і старшынёй Ельскага райвыканкама. Займаў пасады намесніка старшыні, першага намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама, галоўнага саветніка старшыні Гомельскага аблвыканкама.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



ДЗІКАВІЦКАЯ
Алена Міхайлаўна

Член Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў

Пухавіцкая выбарчая акруга № 73

Нарадзілася 3 снежня 1960 года ў горадзе Оршы Віцебскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка па спецыяльнасці «Дашкольнае выхаванне».

Працоўную дзейнасць пачала статыстыкам Барысаўскага гарадскога камітэта ЛКСМБ. Працавала выхавацелем дзіцячых садоў № 26 і 30 горада Барысава, псіхолагам дзіцячага сада № 9 горада Тэрмеза Рэспублікі Узбекістан. Займала пасаду дырэктара дзяржаўнай установы «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва» Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

З'яўлялася дэпутатам Пухавіцкага раённага Савета дэпутатаў, старшынёй камісіі па сацыяльных пытаннях.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па сацыяльнай палітыцы і правах чалавека.

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ганаровымі граматамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.



ДЗЯМІДЧЫК
Генадзь Іосіфавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы

Лагойская выбарчая акруга № 67

Нарадзіўся 28 чэрвеня 1950 года ў гарадскім пасёлку Плешчаніцы Лагойскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, зоаінжынер. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў слесарам-рамонтнікам на Мінскім аўтамабільным заводзе. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў брыгадзірам, галоўным заатэхнікам, намеснікам дырэктара птушкафабрыкі імя Н.К.Крупскай. Займаў пасаду генеральнага дырэктара рэспубліканскага ўнітарнага сельскагаспадарчага вытворчага прадпрыемства «1-я Мінская птушкафабрыка».

Намеснік старшыні Кантрольна-бюджэтнай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



ЖАРАЛО
Уладзімір Ільіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву

Аршанская гарадская выбарчая акруга № 26

Нарадзіўся 19 сакавіка 1949 года ў вёсцы Лозкі Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер шляхоў зносін па эксплуатацыі чыгункі.

Працоўную дзейнасць пачаў дзяжурным па станцыі Іўдзель Сяроўскага аддзялення Свярдлоўскай чыгункі. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў дзяжурным па станцыі Калінкавічы, начальнікам станцый Уза, Таўкачоўскі, Жыткавічы, намеснікам начальніка станцыі Калінкавічы Гомельскага аддзялення, начальнікам станцыі Лунінец Баранавіцкага аддзялення, начальнікам станцыі Віцебск Віцебскага аддзялення, начальнікам Магілёўскага аддзялення, начальнікам Брэсцкага аддзялення Беларускай чыгункі. Займаў пасады першага намесніка Начальніка, Начальніка Беларускай чыгункі.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па эканоміцы і фінансах.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ЖГУН
Мікалай Анатольевіч

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу

Маладзечанская гарадская выбарчая акруга № 70

Нарадзіўся 2 лістапада 1956 года ў вёсцы Вуглы Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-выкладчык машынабудаўнічых дысцыплін; Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай».

Працоўную дзейнасць пачаў слесарам-рамонтнікам на Мінскім прыборабудаўнічым заводзе імя У.І.Леніна. Працаваў выкладчыкам агульнатэхнічных дысцыплін, загадчыкам механіка-тэхналагічнага аддзялення, намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце, дырэктарам установы адукацыі «Маладзечанскі дзяржаўны політэхнічны каледж».

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ЖУРАЎСКАЯ
Валянціна Іосіфаўна

Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву

Кальварыйская выбарчая акруга № 104

Нарадзілася 7 жніўня 1959 года ў горадзе Шахцёрску Данецкай вобласці, Украіна. Закончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М.Горкага па спецыяльнасці «Педагогіка і методыка выхаваўчай работы».

Працоўную дзейнасць пачала кантралёрам аддзела тэхнічнага кантролю Мінскай скургалантарэйнай фабрыкі імя В.У.Куйбышава. Працавала майстрам вытворчага навучання, інжынерам, старшым майстрам, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце вышэйшага прафесійна-тэхнічнага вучылішча лёгкай прамысловасці № 43 горада Мінска. Займала пасады дырэктара сярэдняй школы № 38 горада Мінска, дырэктара ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж лёгкай прамысловасці».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакамі «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», «Выдатнік прафтэхадукацыі».



ЗАЗУЛЯ
Аляксандр Іванавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту

Кобрынская выбарчая акруга № 12

Нарадзіўся 9 ліпеня 1965 года ў вёсцы Гайкоўка Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, юрыст.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працоўную дзейнасць пачаў электрамеханікам Брэсцкай дыстанцыі сігналізацыі і сувязі Беларускай чыгункі. Працаваў слесарам на Кобрынскай прадзільна-ткацкай фабрыцы. Быў інструктарам, другім і першым сакратаром Кобрынскага гаркама ЛКСМБ. Працаваў інспектарам па справах моладзі, юрыстам Кобрынскага гарвыканкама, вядучым юрысконсультам закрытага акцыянернага таварыства «Канцэрн «Факторыя». Займаў пасаду дырэктара закрытага акцыянернага таварыства «Аптымалсэрвіс» у горадзе Кобрыне.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі», сямю юбілейнымі медалямі.



ЗДАНОВІЧ
Уладзімір Мацвеевіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу

Днепра-Бугская выбарчая акруга № 10

Нарадзіўся 15 сакавіка 1959 года ў вёсцы Застаўе Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, радыёфізік; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар сацыяльнай сферы. Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь. Магістр педагогікі.

Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам, інжынерам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Быў выхавальнікам Бездзежскай сярэдняй школы, намеснікам дырэктара Крамноўскай васьмігадовай школы, настаўнікам Ліпніцкай васьмігадовай і Драгічынскай сярэдняй школ. Займаў пасаду дырэктара гімназіі ў горадзе Драгічыне.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу, трэцяга склікання — старшынёй Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па навуцы і адукацыі.

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), чатырма юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».



ІВАНОЎ
Валерый Мікалаевіч

Намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2008–2010), член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы (з 2010)

Шклоўская выбарчая акруга № 90

Нарадзіўся 27 ліпеня 1955 года ў вёсцы Папехінка Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, зоаінжынер; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, палітолаг; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Кіраванне прадпрыемствамі аграпрамысловага комплексу».

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў галоўным заатэхнікам, старшынёй калгаса «Кастрычнік» Круглянскага раёна, першым намеснікам старшыні Круглянскага райвыканкама — начальнікам управлення сельскай гаспадаркі і харчавання. Быў старшынёй калгаса імя Дзімітрава Круглянскага раёна, старшынёй калгаса «Рассвет» імя К.П.Арлоўскага Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. Займаў пасады старшыні Кіраўскага райвыканкама, старшыні Шклоўскага райвыканкама, намесніка старшыні Мінскага аблвыканкама.

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў.

Намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь са снежня 2010 года.

Быў кіраўніком дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, кіраўніком дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За працоўную адзнаку», юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.



ІСАЧАНКА
Таццяна Мікалаеўна

Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту

Магілёўская-Кастрычніцкая выбарчая акруга № 86

Нарадзілася 7 кастрычніка 1957 года ў горадзе Магілёве. Закончыла Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, інжынер-механік; Маскоўскі сучасны гуманітарны інстытут па спецыяльнасці «Юрыспрудэнцыя».

Працоўную дзейнасць пачала чарцёжнікам у інстытуце «Магілёўгрmaмадзянпраект». Працавала старшым тэхнікам, інжынерам Магілёўскага праектна-канструктарскага тэхналагічнага інстытута спецыяльнай тэхналагічнай аснасткі аўтаматызацыі і механізацыі, інжынерам Магілёўскага ліфтабудаўнічага завода. Была інструктарам, загадчыкам аддзела сацыяльна-эканамічнай і прававой работы Магілёўскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў, намеснікам начальніка планава-эканамічнага аддзела вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Магілёўаблгаз». Займала пасаду намесніка старшыні Магілёўскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў.

Выбіралася дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў дваццаць пятага склікання — намеснікам старшыні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па сацыяльнай палітыцы.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.



ІСАЧЭНКА
Ала Іванаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы

Рэчыцкая выбарчая акруга № 44

Нарадзілася 21 снежня 1957 года ў вёсцы Левашы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, фінансіст; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачала інспектарам па бюджэту фінансавага аддзела Брагінскага райвыканкама. Працавала эканамістам, старшым эканамістам па бюджэту, намеснікам загадчыка фінансавага аддзела — начальнікам бюджэтнай інспекцыі, начальнікам фінансавага аддзела Рэчыцкага райвыканкама.

З'яўлялася дэпутатам Рэчыцкага раённага Савета дэпутатаў дваццаць другога, дваццаць трэцяга і дваццаць чацвёртага скліканняў — старшынёй камісіі па сацыяльных пытаннях, ахове здароўя і спорту. Была старшынёй Рэчыцкага раённага савета грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

Член рэспубліканскай рэвізійнай камісіі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік фінансавай сістэмы Рэспублікі Беларусь».



КАВАЛЕВІЧ
Леанід Мікалаевіч

Член Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі

Івацэвіцкая выбарчая акруга № 11

Нарадзіўся 14 сакавіка 1958 года ў пасёлку Нова-Мікалаеўка Сафіеўскага раёна Днепрапятроўскай вобласці, Украіна. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым лесапільнага цэха вытворчага аб'яднання «Івацэвічдрэў». Служыў у радах Узброеных Сіл. Быў сакратаром камітэта камсамола, сакратаром парткама Івацэвіцкага вытворчага дрэваапрацоўчага аб'яднання. Працаваў загадчыкам прамыслова-транспартнага аддзела Івацэвіцкага райкама КПБ. Займаў пасады дырэктара, генеральнага дырэктара дзяржаўнага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Івацэвіцкая ЖКГ».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй НАТА.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, знакам «Ганаровы работнік жыллёва-камунальнай гаспадаркі». Удастоены двойчы ганаровага звання «Чалавек года» (1998, 2001).



КАВАЛЁВА
Валянціна Іванаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД

Светлагорская выбарчая акруга № 46

Нарадзілася 27 красавіка 1957 года ў вёсцы Мірошенкі Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, філолаг; Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст.

Працавала старшай піянерважатай, настаўніцай рускай мовы і літаратуры, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце сярэдняй школы № 7 горада Светлагорска Гомельскай вобласці. Была інструктарам ідэалагічнага аддзела Светлагорскага гаркама КПБ. З'яўлялася намеснікам загадчыка аддзела адукацыі, намеснікам старшыні Светлагорскага гарвыканкама. Займала пасаду намесніка старшыні Светлагорскага райвыканкама.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Член Кантрольна-бюджэтнай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Узнагароджана медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



КАЗАК
Мікалай Станіслававіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу

Каліноўская выбарчая акруга № 108

Нарадзіўся 29 кастрычніка 1945 года ў вёсцы Дзешчанка Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, радыёфізік. Доктар фізіка-матэматычных навук, акадэмік. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі.

Працоўную дзейнасць пачаў старшым інжынерам Інстытута фізікі Акадэміі навук БССР. Быў старшым выкладчыкам кафедры радыёфізікі, загадчыкам кафедры агульнай фізікі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працаваў малодшым і старшым навуковым супрацоўнікам, намеснікам дырэктара па навуковай рабоце, дырэктарам дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут фізікі імя Б.І.Сцяпанава». Займаў пасады акадэміка-сакратара Аддзялення фізікі, матэматыкі і інфарматыкі, галоўнага вучонага сакратара Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



КАЗІМІРЧЫК
Яўгеній Аляксандравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву

Бярозаўская выбарчая акруга № 9

Нарадзіўся 1 чэрвеня 1961 года ў вёсцы Скураты Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-будаўнік; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў сталяром Косаўскага мэблевага вытворчага аб'яднання Івацэвіцкага раёна. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў старшым інжынерам-электрыкам Івацэвіцкага «Райсельэнерга». Быў старшым інжынерам праектна-каштарыснага бюро ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Івацэвіцкага райвыканкама, інжынерам, галоўным інжынерам Івацэвіцкага райгаза. Займаў пасаду дырэктара міжраённага вытворчага ўпраўлення газавай гаспадаркі «Бярозаміжрайгаз».

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па бяспецы, абароне і барацьбе са злачыннасцю.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалём «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава), Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



КАЗЛОЎ
Аляксей Максімавіч

Член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі

Кастрычніцкая выбарчая акруга № 97

Нарадзіўся 4 чэрвеня 1949 года ў вёсцы Карманоўка Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Мінскі радыётэхнічны інстытут, інжынер-канструктар-тэхнолаг радыёапаратуры.

Працоўную дзейнасць пачаў радыёмеханікам радыёатэлье ў горадзе Магілёве. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў інжынерам-тэхнолагам, майстрам-тэхнолагам, намеснікам начальніка цэха, намеснікам сакратара парткама, старшынёй прафкама, начальнікам управлення сацыяльна-бытавога развіцця, намеснікам генеральнага дырэктара навукова-вытворчага аб'яднання «Інтэграл».

Член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па палітычных пытаннях і міжнароднаму супрацоўніцтву.

Узнагароджаны медалямі «За працоўную адзнаку», «За воінскую доблесць», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



КАЗУРА
Эдуард Пятровіч

Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту

Пастаўская выбарчая акруга № 29

Нарадзіўся 2 мая 1949 года ў вёсцы Сяргеявічы Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Ленінградскі сельскагаспадарчы інстытут, інжынер-механік сельскай гаспадаркі; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Дзяржаўнае і мясцовае кіраванне».

Працоўную дзейнасць пачаў брыгадзірам трактарнай брыгады калгаса «Радзіма» Пастаўскага раёна. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў галоўным інжынерам калгаса «Радзіма», намеснікам старшыні калгаса імя Мічурына, старшынёй калгаса «Кастрычнік» Пастаўскага раёна. Быў інструктарам арганізацыйнага аддзела Пастаўскага райкама КПБ, начальнікам перасоўнай механізаванай калоны Пастаўскай райаграпрамтэхнікі, дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Пастаўскі малочны завод». Займаў пасады першага намесніка старшыні, старшыні Пастаўскага райвыканкама.

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём «За воінскую доблесць. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна», юбілейным медалём «60 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



КАНОПЛІЧ
Сяргей Міхайлавіч

Член Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню (2008–2010), старшыня Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню (з 2010)

Палеская выбарчая акруга № 43

Нарадзіўся 28 сакавіка 1957 года ў вёсцы Дзярбінкі Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны аграном.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працоўную дзейнасць пачаў брыгадзірам паляводчай брыгады калгаса «Рэвалюцыя» Ельскага раёна Гомельскай вобласці. Працаваў галоўным аграномам, сакратаром парткама, намеснікам старшыні і старшынёй калгаса «Рэвалюцыя». Займаў пасады першага намесніка старшыні Ельскага райвыканкама — начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшыні Ельскага райвыканкама.

Член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па пытаннях абароны і бяспекі.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



КАРПЕНКА
Ігар Васільевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД (2008–2011), старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД (з 2011)

Ясенінская выбарчая акруга № 100

Нарадзіўся 28 красавіка 1964 года ў горадзе Новакузнецку Кемераўскай вобласці, РСФСР. Закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М.Горкага, настаўнік гісторыі, грамадазнаўства і англійскай мовы; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне міжнародных адносін.

Працоўную дзейнасць пачаў старшым піянерважатым Азінскай сярэдняй школы Полацкага раёна. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў сакратаром камітэта камсамола, начальнікам аддзела, начальнікам управлення выхаваўчай работы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М.Танка. Займаў пасаду прарэктара па выхаваўчай і сацыяльнай рабоце ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка».

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Старшыня Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па гандлёвай палітыцы і міжнароднаму супрацоўніцтву, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Паўночным саветам.

Намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама з ліпеня 2011 года.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



КАРПЯК
Уладзімір Валянцінавіч

Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву

Бабруйская-Першамайская выбарчая акруга № 79

Нарадзіўся 22 ліпеня 1967 года ў горадзе Новыя Акмяне, Літоўская Рэспубліка. Закончыў Рыжскі тэхнічны ўніверсітэт, інжынер-электрык па аўтаматызацыі; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, эканаміст-менеджар.

Працоўную дзейнасць пачаў інжынерам Хмяльніцкага паўночнага прадпрыемства электрычных сетак у горадзе Шапятоўцы, Украіна. Працаваў энергетыкам, старшым майстрам, інжынерам, галоўным энергетыкам, намеснікам галоўнага інжынера па тэхнічнаму развіццю, галоўным інжынерам — першым намеснікам дырэктара завода масавых шын адкрытага акцыянернага таварыства «Белшына».

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па пытаннях абароны і бяспекі.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



КАСЦЮК
Мячыслаў Браніслававіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы

Слонімская выбарчая акруга № 58

Нарадзіўся 9 жніўня 1952 года ў вёсцы Саваздзякі Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Стаўрапольскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны аграном-эканаміст; Мінскую вышэйшую партыйную школу па спецыяльнасці «Партыйнае і савецкае будаўніцтва»; Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачаў мадэльшчыкам на заводзе «Чырвоны металіст» у горадзе Стаўрапалі. Працаваў аграномам калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Дзятлаўскага раёна. Служыў у радах Узброеных Сіл. Быў другім і першым сакратаром Дзятлаўскага райкама ЛКСМБ, загадчыкам сельскагаспадарчага аддзела, другім сакратаром Дзятлаўскага райкама КПБ. Займаў пасады старшыні Дзятлаўскага райвыканкама, старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Гродзенскага аблвыканкама, старшыні Слонімскага райвыканкама.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй НАТА.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



КЛЕБАН
Тамара Міхайлаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці

Лідская выбарчая акруга № 54

Нарадзілася 13 студзеня 1964 года ў вёсцы Шасцілы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-эканаміст; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне міжнародных адносін.

Працоўную дзейнасць пачала кантралёрам на Лідскім міжраённым домабудаўнічым камбінаце. Працавала нарміроўшчыкам у Лідскай перасоўнай механізаванай калоне № 27 аб'яднання «Гроднасаўгасбуд», інжынерам будаўніча ўпраўлення № 103 Лідскага будаўніча-мантажнага трэста № 19. Была галоўным спецыялістам, загадчыкам сектара па працы, намеснікам начальніка і начальнікам упраўлення эканомікі Лідскага гарвыканкама. Займала пасаду начальніка ўпраўлення эканомікі Лідскага райвыканкама.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь.



КЛЯШЧУК
Інэса Анатольеўна

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаннях

Слуцкая выбарчая акруга № 74

Нарадзілася 26 жніўня 1978 года ў вёсцы Гольчыцы Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка, настаўнік матэматыкі і інфарматыкі; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання.

Працавала настаўніцай матэматыкі і інфарматыкі Вясейскай і Бокшыцкай сярэдніх школ Слуцкага раёна, першым сакратаром Слуцкага раённага камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», першым сакратаром Слуцкага гарадскога камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

З'яўлялася дэпутатам Слуцкага раённага Савета дэпутатаў дваццаць чацвёртага склікання.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «60 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».



КОРАП
Раман Леанідавіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД

Чкалаўская выбарчая акруга № 96

Нарадзіўся 8 студзеня 1952 года ў горадзе Мінску. Закончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа»; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст.

Працаваў урачом-анестэзіёлагам-рэаніматолагам медыка-санітарнай часці Магілёўскага камбіната сінтэтычных валокнаў імя У.І.Леніна, галоўным урачом санаторыя-прафілакторыя «Кіравец» Магілёўскага аўтазавода імя С.М.Кірава, урачом-анестэзіёлагам-рэаніматолагам медыка-санітарнай часці Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно». Займаў пасады намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 2-й клінічнай бальніцы, галоўнага ўрача лячэбна-прафілактычнай установы «Гарадская клінічная бальніца хуткай медыцынскай дапамогі» горада Мінска.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва.

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



КОТ
Алег Іванавіч

Член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы

Дзяржынская выбарчая акруга № 65

Нарадзіўся 18 красавіка 1966 года ў вёсцы Макаўчыцы Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Ленінградскае вышэйшае зенітна-ракетнае камандное вучылішча, інжынер па эксплуатацыі радыётэхнічных сродкаў.

Праходзіў ваенную службу ў якасці начальніка зенітнага ракетнага разліку — намесніка камандзіра батарэі Прыкарпацкай ваеннай акругі. Быў памочнікам начальніка 3-га аддзялення Стаўбцоўскага раённага ваеннага камісарыята. Працаваў старшым памочнікам начальніка 1-га аддзялення Дзяржынскага аб'яднанага гарадскога ваеннага камісарыята, намеснікам ваеннага камісара — начальнікам мабілізацыйнага аддзялення, ваенным камісарам Дзяржынскага раённага ваеннага камісарыята.

Член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па пытаннях абароны і бяспекі, намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй НАТА, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Узнагароджаны медалём «За бездакорную службу» III ступені, васьмю юбілейнымі медалямі.



КРЫЖЭВІЧ
Сяргей Іванавіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях

Асіповіцкая выбарчая акруга № 89

Нарадзіўся 17 лютага 1952 года ў горадзе Крычаве Магілёўскай вобласці. Закончыў Мінскую вышэйшую партыйную школу па спецыяльнасці «Вышэйшая партыйна-палітычная адукацыя»; Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, фінансіст, эканаміст.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працоўную дзейнасць пачаў інспектарам дзяржаўных даходаў фінансавага аддзела Шклоўскага райвыканкама. Працаваў інжынерам вытворчага аддзела, старшым эканамістам, старшым інжынерам, начальнікам вытворча-планавага аддзела будаўнічых арганізацый аб'яднання «Белсельбуд». Быў лектарам, інструктарам арганізацыйнага аддзела Крычаўскага гаркама КПБ. Займаў пасады старшыні планавай камісіі, намесніка старшыні выканаўчага камітэта Крычаўскага раённага Савета дэпутатаў, намесніка старшыні Крычаўскага гарвыканкама, намесніка старшыні Чэрыкаўскага райвыканкама, старшыні Клічаўскага райвыканкама.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па бяспецы, абароне і барацьбе са злачыннасцю.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За працоўныя заслугі», шасцю юбілейнымі медалямі, медалём «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава), Ганаровай граматай Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.



КУЖАНАЎ
Уладзімір Іванавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД

Буда-Кашалёўская выбарчая акруга № 38

Нарадзіўся 27 чэрвеня 1952 года ў пасёлку Чырвоны Сцяг Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер; Мінскую вышэйшую партыйную школу, выкладчык грамадскіх дысцыплін; Інстытут дзяржаўнай бяспекі.

Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў брыгадзірам у Мінскім лакаматыўным дэпо. Служыў у органах Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Службе бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Быў афіцыйным прадстаўніком Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь ва Украіне.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па палітычных пытаннях і міжнароднаму супрацоўніцтву.

Узнагароджаны дзевяццю медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Граматай Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі.



КУЗНЯЦОВА
Ларыса Фёдараўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту

Гомельская-Савецкая выбарчая акруга № 34

Нарадзілася 27 красавіка 1958 года ў горадзе Гомелі. Закончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, гісторык.

Працоўную дзейнасць пачала лабарантам кафедры хіміі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працавала старшай піянерважатай, настаўніцай гісторыі сярэдняй школы № 39 горада Гомеля, загадчыкам сектара ўліку і фінансаў Гомельскага райкама ЛКСМБ, адказным сакратаром Гомельскай раённай арганізацыі таварыства «Веды», інструктарам ідэалагічнага аддзела Гомельскага райкама КПБ. Была дырэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце Урыцкай сярэдняй школы, дырэктарам Красненскай сярэдняй школы Гомельскага раёна, дырэктарам сярэдняй школы № 33 горада Гомеля. Займала пасады намесніка кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна горада Гомеля, начальніка аддзела адукацыі Гомельскага гарвыканкама.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



КУЗЬМІЧ
Аляксей Фёдаравіч

Член Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі

Адзінцоўская выбарчая акруга № 101

Нарадзіўся 26 жніўня 1955 года ў вёсцы Свяда Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-цеплаэнергетык.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў электраманцёрам, інжынерам-канструктарам аддзела галоўнага энергетыка Мінскага трактарнага завода. Быў старшым інжынерам лабараторыі, сакратаром камітэта камсамола, намеснікам начальніка аддзела забеспячэння і камплектацыі, старшынёй прафсаюзнага камітэта Мінскага домабудаўнічага камбіната № 3. З'яўляўся начальнікам дарожна-эксплуатацыйнага ўчастка Фрунзенскага раёна горада Мінска, дырэктарам унітарнага прадпрыемства «Рамаўтадар», намеснікам генеральнага дырэктара ўнітарнага прадпрыемства «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама». Займаў пасады намесніка дырэктара па ідэалагічнай рабоце і сацыяльных пытаннях, намесніка дырэктара па кадрах, быту і ідэалагічнай рабоце адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі домабудаўнічы камбінат».

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



КУЛЬША
Ніна Герасімаўна

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу

Столінская выбарчая акруга № 16

Нарадзілася 12 лістапада 1957 года ў вёсцы Хорск Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут, настаўнік матэматыкі.

Працоўную дзейнасць пачала старшай піянерважатай Осаўскай сярэдняй школы Столінскага раёна. Была настаўніцай матэматыкі Дубянецкай васьмігадовай школы Столінскага раёна. Працавала старшай піянерважатай, настаўніцай матэматыкі, намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце, дырэктарам установы адукацыі «Дзяржаўная агульнаадукацыйная сярэдняя школа № 2 горада Століна з музычна-харавым ухілам».

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па навуцы і адукацыі.

Мае два падзячныя пісьмы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ЛАСЯКІН
Аляксандр Міхайлавіч

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу

Віцебская-Кастрычніцкая выбарчая акруга № 20

Нарадзіўся 21 ліпеня 1957 года ў вёсцы Новая Беліца Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут, настаўнік матэматыкі; Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М.Машэрава, юрыст.

Працаваў дырэктарам Глебаўскай васьмігадовай школы Сенненскага раёна, першым сакратаром Сенненскага райкама ЛКСМБ, загадчыкам аддзела прапаганды і культурна-масавай работы Віцебскага абкама ЛКСМБ. Займаў пасаду дырэктара ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны каледж».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ЛАЎРУКЕВІЧ
Ганна Мікалаеўна

Старшыня Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў

Салігорская сельская выбарчая акруга № 76

Нарадзілася 23 верасня 1953 года ў вёсцы Аргелаўшчына Капыльскага раёна Мінскай вобласці. Закончыла Валагодскі малочны інстытут, інжынер-тэхнолаг; Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, эканаміст-менеджар; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачала аперацыйнай медсястрой Беларускай рэспубліканскай станцыі пералівання крыві. Была медсястрой Дзятлаўскай цэнтральнай раённай бальніцы, Крывіцкага дзіцячага сада-яслаў Мядзельскага раёна. Працавала інжынерам-хімікам, інжынерам-тэхнолагам, начальнікам цэха, галоўным тэхнолагам, галоўным інжынерам Слуцкага сыраробнага камбіната. Займала пасады дырэктара Салігорскага гарадскога малочнага завода, генеральнага дырэктара Мінскага дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Мяса-малако», старшыні Салігорскага гарвыканкама, генеральнага дырэктара Беларускага дзяржаўнага аб'яднання арганізацый бытавога абслугоўвання насельніцтва.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, ордэнам Рускай праваслаўнай царквы Святой роўнаапостальнай Вялікай княгіні Вольгі III ступені.



ЛУЗІНА
Валянціна Міхайлаўна

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД

Іўеўская выбарчая акруга № 53

Нарадзілася 31 сакавіка 1952 года ў гарадскім пасёлку Дзятлава Гродзенскай вобласці. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут, настаўнік рускай мовы і літаратуры; Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы, практычны псіхолаг; Мінскую вышэйшую партыйную школу па спецыяльнасці «Вышэйшая партыйна-палітычная адукацыя».

Працоўную дзейнасць пачала настаўніцай сярэдняй школы № 3 горада Ашмяны. Працавала інструктарам, намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Ашмянскага райкама КПБ, загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі, сакратаром і другім сакратаром Іўеўскага райкама КПБ. Была выхавацелем, практычным псіхолагам Іўеўскай дапаможнай школы-інтэрната. Займала пасаду намесніка старшыні Ашмянскага райвыканкама.

З 1998 года з'яўляецца старшынёй Ашмянскага раённага савета грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын». Член рэспубліканскай рэвізійнай камісіі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

Узнагароджана пяццю юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



ЛУКАШОНАК
Валянціна Мікалаеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаннях

Сухараўская выбарчая акруга № 102

Нарадзілася 1 кастрычніка 1952 года ў горадзе Мінску. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, філолаг.

Працоўную дзейнасць пачала лабарантам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працавала старшай піянерважатай, арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы, настаўніцай, намеснікам дырэктара сярэдняй школы № 132 горада Мінска. Была інспектарам аддзела народнай адукацыі Фрунзенскага раёна горада Мінска, дырэктарам сярэдняй школы № 179 горада Мінска. Займала пасаду намесніка кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна горада Мінска.

З'яўлялася дэпутатам Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў дваццаць пятага склікання, удзельнікам чатырох Усебеларускіх народных сходаў.

Старшыня прэзідыума Фрунзенскай раённай арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, упаўнаважаны прадстаўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь у горадзе Мінску па пытаннях развіцця алімпійскага руху, член грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па прававых пытаннях.

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Прэзідыума рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў дзяржаўных і іншых устаноў, ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта і Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, знакамі «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», «За развіццё фізічнай культуры ў Рэспубліцы Беларусь».



ЛЮЦІКАЎ
Васіль Уладзіміравіч

Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі

Жодзінская выбарчая акруга № 66

Нарадзіўся 22 чэрвеня 1957 года ў горадзе Слуцку Мінскай вобласці. Закончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа».

Працоўную дзейнасць пачаў вучнем токара на Слуцкім аўтарамонтным заводзе. Працаваў урачом-інтэрнам-хірургам Барысаўскай гарадской бальніцы, урачом-хірургам Жодзінскай гарадской бальніцы, намеснікам галоўнага ўрача па паліклінічнай рабоце Жодзінскага гарадскога тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання. Быў галоўным урачом санаторыя-прафілакторыя «Дудзінка». Займаў пасаду намесніка начальніка па лячэбна-прафілактычнай рабоце — галоўнага ўрача ўпраўлення спартыўна-аздараўленчай і лячэбна-прафілактычнай работы рэспубліканскага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Беларускі аўтамабільны завод».

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ЛЯВІЦКАЯ
Ганна Віктараўна

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД

Мінская сельская выбарчая акруга № 69

Нарадзілася 22 сакавіка 1961 года ў вёсцы Дукора Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Закончыла Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-стаматолаг; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання.

Працавала ўрачом-стаматолагам, галоўным урачом Міханавіцкай амбулаторыі Мінскага раёна. Займала пасады намесніка галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце Мінскага раённага тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання, галоўнага ўрача ўстановы аховы здароўя «Мінская цэнтральная раённая бальніца».

З'яўлялася дэпутатам Мінскага абласнога Савета дэпутатаў дваццаць пятага склікання.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Член грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя».



ЛЯВОНЕНКА
Валянціна Сцяпанаўна

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД

Купалаўская выбарчая акруга № 95

Нарадзілася 10 сакавіка 1953 года ў гарадскім пасёлку Бальшавік Гомельскага раёна. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, гісторык. Кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Працоўную дзейнасць пачала статыстыкам камітэта камсамола Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Была загадчыкам сектара ўліку камітэта камсамола, тэхнічным сакратаром парткама Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працавала асістэнтам кафедры гісторыі КПСС, асістэнтам кафедры сацыяльна-палітычнай гісторыі, выкладчыкам, дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



МАЁРАЎ
Уладзімір Сяргеевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях

Гомельская сельская выбарчая акруга № 37

Нарадзіўся 6 лістапада 1952 года ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны заатэхнік.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працоўную дзейнасць пачаў старшым заатэхнікам Гомельскага міжгаспадарчага аб'яднання па вытворчасці свініны. Працаваў інструктарам арганізацыйна-інструктарскага аддзела Гомельскага аблвыканкама, арганізацыйнага аддзела Гомельскага райкама КПБ, аддзела арганізацыйна-партыйнай работы Гомельскага абкама КПБ. Быў старшынёй калектыўна-долевай гаспадаркі «Бабовіцкая» Гомельскага раёна. Займаў пасады першага намесніка старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Гомельскага аблвыканкама, старшыні Гомельскага райвыканкама.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй НАТА.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



МАЙСЮК
Уладзімір Уладзіміравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню

Баранавіцкая сельская выбарчая акруга № 7

Нарадзіўся 22 жніўня 1949 года ў горадзе Ляхавічы Брэсцкай вобласці. Закончыў Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут, інжынер-будаўнік.

Працоўную дзейнасць пачаў старшынёй прафкама Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. З'яўляўся загадчыкам арганізацыйнага аддзела, другім сакратаром Брэсцкага гаркама ЛКСМБ. Працаваў старшым інжынерам лабараторыі будаўнічага трэста № 8, прарабам будаўнічага ўпраўлення № 32 будаўнічага трэста № 8 Міністэрства прамысловага будаўніцтва БССР, намеснікам начальніка Ляхавіцкай перасоўнай механізаванай калоны № 13. Быў начальнікам Ляхавіцкай дарожна-будаўнічай перасоўнай механізаванай калоны № 185 Брэсцкага абласнога аб'яднання міжкалгасных будаўнічых арганізацый, начальнікам Баранавіцкага дарожнага рамонтна-будаўнічага ўчастка рэспубліканскага праектна-будаўнічага аб'яднання «Аўтамагістраль» Брэсцкай вобласці, начальнікам дарожна-эксплуатацыйнага ўпраўлення № 3 рэспубліканскага дзяржаўнага вытворчага прадпрыемства «Белаўтастрада» Брэсцкай вобласці. Займаў пасаду генеральнага дырэктара рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства аўтамабільных дарог «Брэстаўтадар».

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па палітычных пытаннях і міжнароднаму супрацоўніцтву.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Ганаровы дарожнік» I і II ступені.



МАНДРОЎСКАЯ
Зінаіда Міхайлаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў

Пінская гарадская выбарчая акруга № 14

Нарадзілася 25 кастрычніка 1954 года ў вёсцы Ялча Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. Закончыла Беларускі тэхналагічны інстытут, хімік-тэхнолаг; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачала інжынерам аддзела тэхнічнага кантролю Пінскага хімкамбіната. Працавала майстрам хімічнага ўчастка, інжынерам-тэхнолагам, намеснікам начальніка аддзела тэхнічнага кантролю, начальнікам тэхнічнага аддзела, галоўным тэхнолагам, галоўным інжынерам рэспубліканскага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Завод «Камертон» у горадзе Пінску Брэсцкай вобласці. Займала пасаду дырэктара вытворчага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «ЭлКіс» грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» ў горадзе Пінску.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



МАСКЕВІЧ
Сяргей Аляксандравіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД (2008–2011), член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД (з 2011)

Гродзенская-Цэнтральная выбарчая акруга № 50

Нарадзіўся 1 жніўня 1953 года ў вёсцы Быкаўка Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Я.Купалы, настаўнік фізікі. Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Аўтар больш як 250 навуковых прац.

Працаваў лабарантам, старшым інжынерам Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Я.Купалы. Служыў у радах Узброеных Сіл. Быў старшым навуковым супрацоўнікам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, прарэктарам па навуковай рабоце, рэктарам установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы».

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь са снежня 2010 года.

Намеснік Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па вывучэнню вопыту дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання.

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



МЕЛЬНІКАЎ
Яўгеній Аляксандравіч

Член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі

Магілёўская-Прамысловая выбарчая акруга № 87

Нарадзіўся 12 лістапада 1950 года ў вёсцы Сідаравічы Магілёўскага раёна. Закончыў Мінскую вышэйшую партыйную школу па спецыяльнасці «Вышэйшая партыйна-палітычная адукацыя».

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым на Магілёўскім камбінаце сінтэтычных валокнаў. Служыў у радах Узброеных Сіл. Быў сакратаром парткама, намеснікам начальніка, начальнікам таварна-сыравіннай вытворчасці Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно». Займаў пасады намесніка старшыні Магілёўскага гарвыканкама, старшыні Магілёўскага абласнога тэлерадыёаб'яднання Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь. Працаваў намеснікам дырэктара завода сінтэтычнага валакна, начальнікам упраўлення па ідэалагічнай рабоце і рабоце з персаналам адкрытага акцыянернага таварыства «Магілёўхімвалакно».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



МІСУРАГІН
Ігнацій Арцёмавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы (2008–2010), старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы (з 2010)

Уручская выбарчая акруга № 109

Нарадзіўся 5 лютага 1947 года ў горадзе Віцебску. Закончыў Калінінградскае вышэйшае ваенна-інжынернае камандное вучылішча, тэхнік-механік; ордэна Леніна Чырвонасцяжную Ваенную інжынерную акадэмію імя В.У.Куйбышава, афіцэр з вышэйшай ваеннай аператыўна-стратэгічнай адукацыяй; Акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР імя К.Я.Варашылава па спецыяльнасці «Камандная ваенна-інжынерная». Генерал-маёр. Кандыдат ваенных навук, дацэнт.

Праходзіў ваенную службу ў якасці камандзіра ўзвода, роты, начальніка інжынернай службы брыгады, камандзіра батальёна, палка, начальніка інжынернай службы 39-й гвардзейскай мотастралковай дывізіі, намесніка начальніка інжынерных войскаў 14-й гвардзейскай агульнавайсковай арміі. Быў начальнікам інжынернай службы, намеснікам камандуючага па выхаваўчай рабоце і кадрах 7-й танкавай арміі, начальнікам штаба — намеснікам начальніка ўпраўлення інжынерных войскаў, начальнікам упраўлення інжынерных войскаў Генеральнага штаба Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Удзельнік ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Займаў пасаду начальніка ўстановы адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь».

Старшыня Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па сацыяльна-эканамічных і прававых пытаннях.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнамі «За службу Радзіме» II і III ступені, чатырнаццаццю медалямі СССР і Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



МІХАЛЕВІЧ
Анфім Іванавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаннях

Лепельская выбарчая акруга № 23

Нарадзіўся 26 мая 1949 года ў вёсцы Старыя Шарабаі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, ветэрынарны ўрач; Беларускі інстытут правазнаўства, юрыст.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў галоўным ветэрынарным урачом калгаса «Парыжская камуна», дырэктарам саўгаса «Яблынька» Глыбоцкага раёна. Быў першым намеснікам старшыні Бешанковіцкага райвыканкама — начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшынёй калгаса «Палітаддзелец» Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Займаў пасаду старшыні Чашніцкага райвыканкама.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», пяццю юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



МІХАСЁЎ
Уладзімір Ільіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі

Рагачоўская выбарчая акруга № 45

Нарадзіўся 14 кастрычніка 1949 года ў вёсцы Сасноўка Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер-будаўнік; Мінскую вышэйшую партыйную школу, спецыяліст у галіне партыйнага і савецкага будаўніцтва. Заслужаны работнік сферы абслугоўвання Рэспублікі Беларусь.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў майстрам, прарабам, старшым прарабам будаўнічага ўпраўлення № 61 будаўнічага трэста № 10 горада Гомеля. Быў старшым прарабам упраўлення вытворча-тэхналагічнай камплектацыі вытворчага будаўніча-мантажнага аб'яднання «Гомельпрамбуд», загадчыкам аддзела камунальнай гаспадаркі Гомельскага гарвыканкама. З'яўляўся галоўным інжынерам, намеснікам начальніка ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гомельскага аблвыканкама. Займаў пасады намесніка старшыні Гомельскага гарвыканкама, начальніка ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гомельскага аблвыканкама.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



НОВІК
Алена Аляксандраўна

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу

Мясціжская выбарчая акруга № 72

Нарадзілася 10 красавіка 1962 года ў вёсцы Алёхнавічы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, гісторык.

Працавала выхавацелем, настаўніцай пачатковых класаў, настаўніцай гісторыі, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце, дырэктарам установы адукацыі «Шчэпіцкая дзяржаўная агульнаадукацыйная сярэдняя школа» Клецкага раёна Мінскай вобласці.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.



ОРДА
Міхаіл Сяргеевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту

Дзятлаўская выбарчая акруга № 55

Нарадзіўся 28 верасня 1966 года ў гарадскім пасёлку Дзятлава Гродзенскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, ветэрынарны ўрач; Расійскую акадэмію дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі па спецыяльнасці «Муніцыпальнае кіраванне».

Працоўную дзейнасць пачаў слесарам у калгасе «Расія» Дзятлаўскага раёна. Служыў у радах Узброеных Сіл. З'яўляўся камандзірам абласнога штаба студэнцкіх атрадаў Віцебскай вобласці, дырэктарам абласной службы добраахвотнай працы моладзі, прэзідэнтам Рэспубліканскай асацыяцыі міжнародных маладзёжных абменаў і турызму. Працаваў другім сакратаром Цэнтральнага камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі патрыятычны саюз моладзі», першым сакратаром Цэнтральнага камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Быў упаўнаважаным Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па Гродзенскай вобласці.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Узначальвае савет дзіцяча-юнацкага клуба па хакею «Залатая шайба».

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



ПАЛЯНСКАЯ
Галіна Уладзіміраўна

Старшыня Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі

Коласаўская выбарчая акруга № 106

Нарадзілася 10 чэрвеня 1950 года ў горадзе Валгаградзе, РСФСР. Закончыла Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, архітэктар. Кандыдат архітэктуры, дацэнт.


Працоўную дзейнасць пачала архітэктарам дзяржаўнага праектнага інстытута «Мінскпраект». Працавала асістэнтам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, намеснікам дэкана і дэканам архітэктурнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі.

Кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя.

Член савета Беларускага саюза архітэктараў.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Удастоена ганаровага звання «Мінчанін года — 2004».



ПАПКОЎ
Аляксандр Андрэевіч

Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту

Сенненская выбарчая акруга № 30

Нарадзіўся 2 студзеня 1948 года ў вёсцы Шчокатава Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны аграном; Мінскую вышэйшую партыйную школу па спецыяльнасці «Вышэйшая партыйна-палітычная адукацыя». Кандыдат эканамічных навук.

Працоўную дзейнасць пачаў галоўным аграномам калгаса «Іскра» Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў галоўным аграномам, старшынёй калгаса імя Андрэева Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Быў першым намеснікам старшыні і старшынёй Шклоўскага райвыканкама, першым сакратаром Шклоўскага райкама КПБ, старшынёй Круглянскага райвыканкама. Займаў пасады Намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, рэктара ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», намесніка Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па заканадаўству і Рэгламенту.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За працоўную доблесць», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ПАЎЛОВІЧ
Анатоль Уладзіміравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву

Васняцоўская выбарчая акруга № 93

Нарадзіўся 20 ліпеня 1953 года ў вёсцы Зароўцы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, інжынер-механік.

Працоўную дзейнасць пачаў інжынерам-тэхнолагам Адзінаццатага дзяржаўнага падшыпнікавага завода ў горадзе Мінску. Працаваў намеснікам начальніка цэха, намеснікам начальніка аддзела, сакратаром парткама, галоўным тэхнолагам, намеснікам тэхнічнага дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Мінскі падшыпнікавы завод».

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — старшынёй Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву.

Намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ПІШЧ
Святлана Сяргееўна

Член Пастаяннай камісіі па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту

Баранавіцкая-Усходняя выбарчая акруга № 6

Нарадзілася 16 жніўня 1965 года ў сяле Тарангул Ленінскага раёна Паўночна-Казахстанскай вобласці, Казахстан. Закончыла Беларускі інстытут правазнаўства па спецыяльнасці «Бухгалтарскі ўлік, аналіз, аўдыт»; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне і права».

Працоўную дзейнасць пачала рэвізорам кантрольна-рэвізійнага аддзела аб'яднання «Гроднааблплодагароднінагас». Працавала бухгалтарам, эканамістам, дырэктарам магазіна, генеральным дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Гарант-Сэрвіс» у горадзе Баранавічы Брэсцкай вобласці.

З'яўлялася дэпутатам Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў дваццаць пятага склікання. Член прэзідыума Баранавіцкай гарадской арганізацыі грамадскага аб'яднання «Белая Русь».

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па бюджэту і фінансах, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалём «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава).



ПЯТРОВІЧ
Уладзімір Вікенцьевіч

Член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву

Бярэзінская выбарчая акруга № 61

Нарадзіўся 20 студзеня 1952 года ў вёсцы Калоднікі Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер шляхоў зносін.

Працоўную дзейнасць пачаў прарабам дарожна-эксплуатацыйнага ўпраўлення № 135 Мінскага абласнога вытворчага ўпраўлення будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог у горадзе Стоўбцы Мінскай вобласці. Працаваў галоўным інжынерам, начальнікам філіяла камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскаблдарбуд» — дарожнага рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 121 у горадзе Чэрвені Мінскай вобласці.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па эканамічнай палітыцы.



РАЗГАНАЎ
Аляксандр Іванавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях

Магілёўская сельская выбарчая акруга № 88

Нарадзіўся 6 лютага 1953 года ў вёсцы Прудок Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны аграном.

Працаваў брыгадзірам, кіраўніком аддзялення «Рогі» калгаса «Зара», намеснікам старшыні калгаса «Савецкая Беларусь», намеснікам старшыні і старшынёй калгаса «Зара» Слаўгарадскага раёна. Займаў пасады намесніка старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Магілёўскага аблвыканкама, старшыні Магілёўскага райвыканкама.

З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па аграпрамысловай палітыцы, прыродакарыстанню і экалогіі.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, дзвюма ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



РУСЫ
Міхаіл Іванавіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню (2008–2010), член Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню (з 2010)

Жыткавіцкая выбарчая акруга № 39

Нарадзіўся 23 лістапада 1954 года ў вёсцы Вароніна Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны аграном; Мінскую вышэйшую партыйную школу, выкладчык грамадскіх дысцыплін.

Працоўную дзейнасць пачаў галоўным аграномам калгаса імя Леніна Жыткавіцкага раёна. Працаваў намеснікам старшыні і старшынёй калгаса імя Леніна Жыткавіцкага раёна, першым намеснікам старшыні Кармянскага райвыканкама — начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання. Быў другім сакратаром Кармянскага райкама КПБ, інструктарам аддзела арганізацыйна-партыйнай работы ЦК КПБ, першым сакратаром Стаўбцоўскага райкама КПБ. Займаў пасады старшыні Камітэта па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванню пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, Міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, кіраўніка аддзялення Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі ў горадзе Санкт-Пецярбургу.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — старшынёй Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях.

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь са снежня 2010 года.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па аграрнай палітыцы, прыродных рэсурсах і экалогіі, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Паўночным саветам.

Узнагароджаны ордэнам «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



РЭМША
Марына Іванаўна

Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі

Гродзенская-Паўночная выбарчая акруга № 51

Нарадзілася 8 сакавіка 1965 года ў горадзе Варкуце, Комі АССР. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа».

Працоўную дзейнасць пачала санітаркай Лідскай цэнтральнай раённай бальніцы. Працавала ўрачом-інтэрнам пульманалагічнага аддзялення Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы, урачом хуткай медыцынскай дапамогі Гродзенскай цэнтральнай раённай бальніцы і Гродзенскага гарадскога клінічнага аб'яднання «Хуткая медыцынская дапамога», участковым урачом-тэрапеўтам, загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення 1-й гарадской паліклінікі горада Гродна. Займала пасады намесніка начальніка аддзела аховы здароўя Гродзенскага гарвыканкама, загадчыка Гродзенскай гарадской паліклінікі № 4 — філіяла ўстановы аховы здароўя «Гродзенская цэнтральная гарадская паліклініка».

З'яўлялася дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў дваццаць пятага склікання.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



САКАДЫНЕЦ
Алег Сцяпанавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі

Быхаўская выбарчая акруга № 82

Нарадзіўся 7 лістапада 1951 года ў вёсцы Баркі Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа».

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў урачом-інтэрнам, урачом-псіхіятрам, загадчыкам аддзялення, намеснікам галоўнага ўрача Магілёўскай абласной псіхіятрычнай бальніцы. Займаў пасаду першага намесніка начальніка ўпраўлення аховы здароўя Магілёўскага аблвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па інфармацыйнай палітыцы.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



САМАСЕЙКА
Мікалай Леанідавіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўству і судова-прававых пытаннях

Старавіленская выбарчая акруга № 105

Нарадзіўся 3 кастрычніка 1959 года ў горадзе Маскве, РСФСР. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, юрыст.

Працоўную дзейнасць пачаў слесарам-інструментальшчыкам у Мінскім вытворчым аб'яднанні «Гарызонт». Служыў у радах Узброеных Сіл. Быў суддзёй народнага суда Фрунзенскага раёна горада Мінска, суддзёй судовай калегіі па крымінальных справах Мінскага гарадскога суда. Працаваў суддзёй, старшынёй суда Цэнтральнага раёна горада Мінска.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па заканадаўству і Рэгламенту.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



СІНЯКОЎ
Уладзімір Яўцехавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню

Маладзечанская сельская выбарчая акруга № 71

Нарадзіўся 20 лютага 1947 года ў гарадскім пасёлку Стрэшын Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, вучоны заатэхнік; Мінскую вышэйшую партыйную школу па спецыяльнасці «Вышэйшая партыйна-палітычная адукацыя».

Працоўную дзейнасць пачаў загадчыкам фермы калгаса «1 Мая» Жлобінскага раёна. Працаваў галоўным заатэхнікам калгаса «1 Мая», упраўлення сельскай гаспадаркі Жлобінскага райвыканкама. Быў загадчыкам сельскагаспадарчага аддзела Жлобінскага гаркама КПБ, інструктарам сельскагаспадарчага аддзела Гомельскага абкама КПБ, інструктарам аграрнага аддзела ЦК КПБ, першым сакратаром Полацкага райкама КПБ. Займаў пасады памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўнага інспектара па Мінскай вобласці, начальніка галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і ліквідацыі наступстваў аварый.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», пяццю юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.



СКАВАРОДКА
Уладзімір Юр'евіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці

Міёрская выбарчая акруга № 24

Нарадзіўся 1 кастрычніка 1954 года ў вёсцы Канахі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Велікалуцкі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны аграном.

Працоўную дзейнасць пачаў памочнікам камбайнера калгаса «Шлях да камунізму» Міёрскага раёна. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў брыгадзірам, галоўным аграномам калгаса «Шлях да камунізму». Быў намеснікам старшыні калгаса «Баявы партызан», загадчыкам сельскагаспадарчага аддзела Міёрскага райкама КПБ, старшынёй калгаса «1 Мая» Міёрскага раёна. Займаў пасады старшыні Міёрскага раённага аграпрамысловага аб'яднання, старшыні Міёрскага раённага Савета дэпутатаў, першага сакратара Міёрскага райкама КПБ, першага намесніка старшыні Міёрскага райвыканкама — начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшыні Міёрскага райвыканкама.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



СПІЛЬНІЧЭНКА
Ігар Азоравіч

Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі

Вілейская выбарчая акруга № 64

Нарадзіўся 8 кастрычніка 1962 года ў горадзе Слуцку Мінскай вобласці. Закончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа».

Працаваў урачом-інтэрнам аддзялення анестэзіялогіі і рэаніматалогіі Мінскай абласной клінічнай бальніцы. Быў урачом анестэзіёлагам-рэаніматолагам, намеснікам галоўнага ўрача па медыцынскаму абслугоўванню насельніцтва Слуцкага тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання. Займаў пасаду галоўнага ўрача ўстановы аховы здароўя «Вілейская цэнтральная раённая бальніца».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



СУХАВЕЙ
Святлана Іванаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу

Масюкоўшчынская выбарчая акруга № 103

Нарадзілася 28 кастрычніка 1952 года ў горадзе Мазыры Гомельскай вобласці. Закончыла Усесаюзны дзяржаўны інстытут кінематаграфіі, акцёр драматычнага тэатра і кіно. Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь.

Працавала актрысай, вядучым майстрам сцэны тэатра-студыі кінаакцёра рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм».

Сыграла больш як 45 роляў у мастацкіх фільмах і серыялах кінастудый «Беларусьфільм», «Масфільм», «Ленфільм», «Узбекфільм», «ДЭФА» (ГДР), Свярдлоўскай кінастудыі і кінастудыі імя А.Даўжэнкі.

З'яўляецца старшынёй грамадскага аб'яднання «Беларуская гільдыя акцёраў кіно», членам прэзідыума Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, членам савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па культуры, інфармацыі, турызму і спорту.

Узнагароджана медалямі Францыска Скарыны, Пушкіна (Расійская Федэрацыя).



СЦЯПУРА
Васілій Ігнацьевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях

Мастоўская выбарчая акруга № 56

Нарадзіўся 6 лютага 1952 года ў вёсцы Раманавічы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, ветэрынарны ўрач. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў ветэрынарным фельчарам Любчанскага ветэрынарнага ўчастка Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў ветэрынарным фельчарам саўгаса «Парэчча», галоўным ветэрынарным урачом саўгаса «Горка», старшынёй калгаса «1 Мая» Дзятлаўскага раёна. Займаў пасады старшыні Воранаўскага райвыканкама, першага намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па аграрнай палітыцы, прыродных рэсурсах і экалогіі.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», ордэнам Пашаны, шасцю юбілейнымі медалямі, ордэнам Беларускай праваслаўнай царквы Святіцеля Кірылы Тураўскага II ступені.



СЯМАШКА
Сяргей Аляксандравіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву

Віцебская-Чыгуначная выбарчая акруга № 19

Нарадзіўся 12 кастрычніка 1960 года ў вёсцы Коцькі Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Ленінградскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер шляхоў зносін — будаўнік; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар інфармацыйных сістэм.

Працаваў дарожным майстрам, галоўным інжынерам Шаўляйскай дыстанцыі пуці, начальнікам пуцявой машыннай станцыі № 94 Прыбалтыйскай чыгункі. Быў галоўным інжынерам пуцявой машыннай станцыі № 118 Віцебскай дыстанцыі пуці Беларускай чыгункі. Займаў пасаду намесніка начальніка па кадрах і быту Віцебскай дыстанцыі пуці Беларускай чыгункі.

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ТАЛКАЧОЎ
Віктар Іванавіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву

Грушаўская выбарчая акруга № 98

Нарадзіўся 13 мая 1949 года ў вёсцы Шышчыцы Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер шляхоў зносін; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст. Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў слесарам Мінскага вагоннага дэпо Беларускай чыгункі. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл быў майстрам вытворчага навучання гарадскога прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 34 чыгуначнага транспарту горада Мінска. Працаваў майстрам інструментальнага ўчастка, начальнікам кавальна-механічнага цэха, намеснікам дырэктара па камерцыйных пытаннях, дырэктарам вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскі вагонарамонтны завод імя А.Ф.Мяснікова».

Намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы.

Узнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, знакамі «Ганаровому чыгуначніку», «Ганаровы транспартнік».



УСІК
Васілій Пятровіч

Член Пастаяннай камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы

Любанская выбарчая акруга № 68

Нарадзіўся 19 ліпеня 1955 года ў вёсцы Прусы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны аграном; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст. Кандыдат эканамічных навук.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым паляводчай брыгады саўгаса «Чырвоны сцяг» Старадарожскага раёна. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў брыгадзірам трактарнай брыгады, галоўным аграномам саўгаса «Чырвоны сцяг», намеснікам старшыні калгаса імя Жданава, старшынёй калгаса «Залужжа» Старадарожскага раёна. Займаў пасады першага намесніка старшыні Старадарожскага райвыканкама — начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшыні Старадарожскага райвыканкама.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».



ФЕДАРУК
Ніна Фёдараўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі

Мухавецкая выбарчая акруга № 4

Нарадзілася 25 ліпеня 1951 года ў вёсцы Воля Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа». Заслужаны работнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачала медсястрой Пялішчанскага ўрачэбнага ўчастка Камянецкага раёна. Працавала ўрачом-інтэрнам Брэсцкай абласной бальніцы, участковым урачом-тэрапеўтам, загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення Мікашэвіцкай бальніцы Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці. Была галоўным урачом Дамачаўскай пасялковай бальніцы Брэсцкага раёна. Займала пасаду галоўнага ўрача Брэсцкага раённага тэрытарыяльна-медыцынскага аб'яднання.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па прававых пытаннях.

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



ФІЛІМОНЧЫК
Таццяна Сцяпанаўна

Член Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі

Гомельская-Прамысловая выбарчая акруга № 35

Нарадзілася 3 снежня 1949 года ў горадзе Жлобіне Гомельскай вобласці. Закончыла Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер шляхоў зносін — механік; Акадэмію кіравання пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачала лабарантам на Чалябінскім трактарным заводзе. Працавала брыгадзірам Жлобінскага вагоннага дэпо Беларускай чыгункі, майстрам дрэваапрацоўчага цэха, інжынерам-тэхнолагам вагоназборачнага цэха Гомельскага вагонарамонтнага завода. Была інжынерам-канструктарам па таварах народнага спажывання канструктарскага бюро, інжынерам-тэхнолагам тэхналагічнага бюро, сакратаром парткама Гомельскага вагонарамонтнага завода. Займала пасады сакратара выканкама Савецкага раёна горада Гомеля, старшыні Савецкага раённага Савета народных дэпутатаў горада Гомеля, кіраўніка адміністрацыі Савецкага раёна горада Гомеля.

З'яўлялася дэпутатам Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў, Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па эканоміцы і фінансах.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



ЦІХАНСКАЯ
Раіса Аляксандраўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД

Калінкавіцкая выбарчая акруга № 41

Нарадзілася 2 студзеня 1951 года ў вёсцы Малоткавічы Жабчыцкага раёна Пінскай вобласці. Закончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, выкладчык біялогіі і хіміі.

Працоўную дзейнасць пачала вучаніцай лабаранта на Сызранскім хлебазаводзе. Працавала швачкай на гомельскай фабрыцы «8 Сакавіка», інструктарам Савецкага райкама камсамола горада Гомеля, загадчыкам арганізацыйна-інструктарскага аддзела Гомельскага гарвыканкама, інструктарам арганізацыйнага аддзела Цэнтральнага райкама КПБ горада Гомеля. Была намеснікам загадчыка аддзела арганізацыйнай і кадравай работы Гомельскага абласнога Савета народных дэпутатаў, намеснікам начальніка ўпраўлення, начальнікам упраўлення арганізацыйна-кадравай работы Гомельскага аблвыканкама. Займала пасаду намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях знешняй палітыкі.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



ЧЫКІЛЁЎ
Аляксандр Сцяпанавіч

Член Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі


Гомельская-Юбілейная выбарчая акруга № 31

Нарадзіўся 2 жніўня 1949 года ў горадзе Жлобіне Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер шляхоў зносін — будаўнік. Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працоўную дзейнасць пачаў майстрам перасоўна-механізаванай калоны № 40 трэста «Гомельсельгасбуд». Працаваў інжынерам праектна-каштарыснага бюро будаўнічага трэста № 10 горада Гомеля, намеснікам начальніка перасоўнай механізаванай калоны № 111 аб'яднання «Гомельпрамбуд», начальнікам упраўлення вытворча-тэхналагічнай камплектацыі будаўніча-мантажнага трэста № 27 горада Гомеля. Быў галоўным інжынерам будаўніча-мантажнага трэста № 40 горада Жлобіна. Займаў пасаду генеральнага дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельпрамбуд».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Паўночным саветам.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейным медалём «60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Ганаровы будаўнік».



ШАМАЛЬ
Алена Уладзіміраўна

Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі

Бабруйская-Ленінская выбарчая акруга № 78

Нарадзілася 8 мая 1973 года ў сяле Цеменічы Бранскага раёна Бранскай вобласці, РСФСР. Закончыла Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа».

Працавала ўрачом-педыятрам медыка-санітарнай часці вытворчага аб'яднання «Бабруйскшына», намеснікам галоўнага ўрача ўстановы аховы здароўя «Бабруйская цэнтральная бальніца».

З'яўлялася дэпутатам Бабруйскага гарадскога Савета дэпутатаў дваццаць пятага склікання. Была ініцыятарам адкрыцця Бабруйскага аддзялення грамадскага аб'яднання Беларускай гуманітарнай няўрадавай арганізацыі «Дзіцячы дыябет».

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ШАЎКО
Аляксандр Аляксандравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па грашова-крэдытнай палітыцы і банкаўскай дзейнасці

Гомельская-Цэнтральная выбарчая акруга № 33

Нарадзіўся 15 чэрвеня 1950 года ў вёсцы Бяседкі Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, інжынер-механік. Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Працаваў майстрам, начальнікам цэха, галоўным тэхнолагам, намеснікам генеральнага дырэктара па вытворчасці, галоўным інжынерам, генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Гомельскі станкабудаўнічы завод імя С.М.Кірава».

Выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычнаму комплексу, транспарту, сувязі і прадпрымальніцтву.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па эканамічнай палітыцы.

Узнагароджаны юбілейным медалём «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.



ШАЦЬКО
Аляксандр Віктаравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу

Гомельская-Навабеліцкая выбарчая акруга № 36

Нарадзіўся 3 верасня 1963 года ў горадзе Магдэбургу, Германская Дэмакратычная Рэспубліка. Закончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, выкладчык матэматыкі; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання.

Працоўную дзейнасць пачаў інжынерам Гомельскага канструктарскага бюро сістэмнага праграмавання. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў настаўнікам, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце сярэдніх школ № 19 і 56 горада Гомеля, дырэктарам Гомельскай Ірынінскай гімназіі.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па інфармацыйнай палітыцы.

Узнагароджаны медалём «За адзнаку ў воінскай службе», юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «70 гадоў Узброеных Сіл СССР», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



ШЧЭРБАЧЭВІЧ
Тамара Георгіеўна

Член Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню

Партызанская выбарчая акруга № 110

Нарадзілася 15 верасня 1961 года ў пасёлку Паўлаўску Карасуцкага раёна Кустанайскай вобласці, Рэспубліка Казахстан. Закончыла Мінскі інстытут культуры, рэжысёр масавых свят; Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М.Танка, выкладчык гісторыі.

Працоўную дзейнасць пачала матальшчыцай на Дзяржынскай тэкстыльнай фабрыцы. Была вучаніцай кантралёра на маторарамонтным заводзе ў горадзе Дзяржынску Мінскай вобласці. Працавала загадчыкам клуба Мінскага авіяцыйнага тэхнічнага вучылішча грамадзянскай авіяцыі, намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце сярэдніх школ № 68 і 85 горада Мінска, дырэктарам сярэдняй школы № 172 горада Мінска. Займала пасады дырэктара Нацыянальнага дзяржаўнага гуманітарнага ліцэя імя Я.Коласа, дырэктара ўстановы адукацыі «Мінскае дзяржаўнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 55 будаўнікоў».

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакамі «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», «За заслугі ў будаўніцтве».



ШЫЛАВА
Святлана Дзмітрыеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі

Паўднёва-Заходняя выбарчая акруга № 99

Нарадзілася 18 красавіка 1961 года ў вёсцы Ульянавічы Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыла Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут па спецыяльнасці «Лячэбная справа». Кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт.

Працавала медыцынскай сястрой, урачом-акушэрам-гінекалагам, старшынёй прафсаюзнага камітэта 5-й клінічнай бальніцы горада Мінска. Была асістэнтам, дацэнтам кафедры акушэрства і гінекалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт». Займала пасаду галоўнага акушэра-гінеколага аддзела медыцынскай дапамогі мацярам і дзецям упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па культуры, інфармацыі, турызму і спорту.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ганаровымі граматамі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



ШЭЎЧЫК
Канстанцін Фёдаравіч

Член Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтву, гандлю і прыватызацыі

Пінская сельская выбарчая акруга № 15

Нарадзіўся 5 студзеня 1948 года ў вёсцы Лахва Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-будаўнік.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым на Мікашэвіцкім лесазаводзе Лунінецкага раёна. Працаваў стропальшчыкам на заводзе нафтавага машынабудавання ў горадзе Волгаградзе, РСФСР. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў майстрам, прарабам, старшым прарабам, намеснікам начальніка, галоўным інжынерам, начальнікам перасоўнай механізаванай калоны № 30 трэста «Пінсксаўгасбуд». Быў намеснікам старшыні Пінскага райвыканкама. Займаў пасаду генеральнага дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Пінсксаўгасбуд».

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.



ЭЛЬЯШЭВІЧ
Леанід Уладзіміравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях

Ваўкавыская выбарчая акруга № 48

Нарадзіўся 20 лютага 1951 года ў вёсцы Чарнякі Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, вучоны заатэхнік.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў загадчыкам вытворчага ўчастка, галоўным заатэхнікам калгаса «Чырвоны сцяг» Шчучынскага раёна, галоўным заатэхнікам упраўлення сельскай гаспадаркі Шчучынскага райвыканкама. Быў першым намеснікам старшыні Шчучынскага раённага аграпрамысловага аб'яднання, першым намеснікам начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Шчучынскага райвыканкама, старшынёй калгаса імя У.І.Леніна Шчучынскага раёна. Займаў пасаду старшыні Зэльвенскага райвыканкама.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Паўночным саветам.

Узнагароджаны медалём «За воінскую доблесць. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ЮЖЫК
Пётр Уладзіміравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі

Полацкая гарадская выбарчая акруга № 28

Нарадзіўся 13 ліпеня 1946 года ў вёсцы Зарудзічы Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, гісторык; Мінскую вышэйшую партыйную школу па спецыяльнасці «Вышэйшая партыйна-палітычная адукацыя».

Працоўную дзейнасць пачаў токарам на Маладзечанскім гарпрамкамбінаце. Быў настаўнікам працы і фізкультуры ў сярэдніх школах Смаргонскага раёна. Працаваў карэспандэнтам смаргонскай раённай газеты «Светлы шлях», загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі Смаргонскага райкама КПБ, намеснікам старшыні Смаргонскага райвыканкама, галоўным спецыялістам Арганізацыйнага аддзела Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, саветнікам-кансультантам аддзела арганізацыйнага забеспячэння Сакратарыята Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Займаў пасады галоўнага інспектара па Віцебскай вобласці Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй НАТА.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём «Ветэран працы», юбілейным медалём «60 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ЮРГЕЛЕВІЧ
Галіна Мікалаеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу

Шабаноўская выбарчая акруга № 91

Нарадзілася 30 красавіка 1954 года ў вёсцы Валяр'янава Мінскага раёна. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, географ.

Працоўную дзейнасць пачала механазборшчыцай Мінскага гадзіннікавага завода. Працавала старшым тэхнікам інстытута «БелНДІпаліваправект», старшай піянерважатай Бараўлянскай сярэдняй школы Мінскага раёна, інжынерам інстытута «Сельгастэхпраект» у горадзе Мінску, настаўніцай Бараўлянскай сярэдняй школы Мінскага раёна і сярэдняй школы № 162 горада Мінска. Была інструктарам аддзела прапаганды Заводскага райкама КПБ горада Мінска, дырэктарам сярэдніх школ № 43 і 162 горада Мінска. Займала пасаду начальніка ўпраўлення адукацыі адміністрацыі Заводскага раёна горада Мінска.

Выбіралася дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя.

Узнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ЮШКЕВІЧ
Аляксандр Мікалаевіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі

Магілёўская-Цэнтральная выбарчая акруга № 85

Нарадзіўся 12 мая 1972 года ў горадзе Магілёве. Закончыў Магілёўскі тэхналагічны інстытут, інжынер па аўтаматызацыі тэхналагічных працэсаў і вытворчасцей; Беларускі інстытут правазнаўства па спецыяльнасці «Юрыст-прававед».

Працаваў слесарам, інжынерам-праграмістам Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно». Быў другім і першым сакратаром Магілёўскага абласнога камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі патрыятычны саюз моладзі», першым сакратаром Магілёўскага абласнога камітэта грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Займаў пасаду выканаўчага дырэктара філіяла № 700 Магілёўскага абласнога ўпраўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк».

Выбіраўся дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

З'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Член грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Старшыня рэспубліканскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Мае Падзяку Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Падзяку Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы. Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

ЧЛЕНЫ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ

Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

чацвёртага склікання

Біяграфічныя даведкі



АВЕРЫН
Віктар Сяргеевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбраны ад Гомельскай вобласці

Нарадзіўся 5 ліпеня 1954 года ў горадзе Магілёве. Закончыў Маскоўскую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга ветэрынарную акадэмію імя К.І.Скрабіна, біяхімік. Доктар біялагічных навук. Аўтар больш як 160 навуковых прац, у тым ліку дзвюх манаграфій.

Працаваў старшым лабарантам, малодшым навуковым супрацоўнікам, старшым навуковым супрацоўнікам Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута фізіялогіі, біяхіміі і харчавання жывёл, старшым навуковым супрацоўнікам лабараторыі № 2, намеснікам дырэктара па навуковай працы, выконваючым абавязкі дырэктара рэспубліканскага навукова-даследчага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут радыялогіі», загадчыкам аддзела радыяцыйнай аховы навуковага аддзела дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека».

Дырэктар рэспубліканскага навукова-даследчага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут радыялогіі» ў горадзе Гомелі.

Намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Паўночным саветам.

Член аб'яднанага навукова-тэхнічнага савета Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Расійскай Федэрацыі з беларускага боку, член савета па правядзенню экспертызы навукова-даследчых, вопытна-канструктарскіх і вопытна-тэхналагічных работ, член Міжведамаснага экспертнага савета па пераадоленню наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Дэпартамента па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалямі «За супрацоўніцтва ў імя выратавання» Расійскай Федэрацыі, «За заслугі» II ступені Цэнтральнага Праўлення Агульнарасійскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Саюз «Чарнобыль» Расіі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Камітэта па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам «Юбілейны медаль «У гонар 80-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», знакам «У памяць аб ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС» Прэзідыума Цэнтральнага Савета Саюза «Чарнобыль» Расіі.



АНІКЕЕВА
Марына Яўгенаўна

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Выбрана ад Брэсцкай вобласці

Нарадзілася 4 чэрвеня 1968 года ў вёсцы Арцюшына Пскоўскага раёна Пскоўскай вобласці РСФСР. Закончыла Рыжскі Чырванасцяжны інстытут інжынераў грамадзянскай авіяцыі імя Ленінскага камсамола, інжынер-эканаміст.

Працавала бухгалтарам Бярозаўскага сыраробнага камбіната, эканамістам па планаванню, вядучым эканамістам па працы, галоўным эканамістам, намеснікам дырэктара па эканоміцы — галоўным эканамістам адкрытага акцыянернага таварыства «Бярозаўскі сыраробны камбінат».

Першы намеснік дырэктара адкрытага акцыянернага таварыства «Бярозаўскі сыраробны камбінат» Брэсцкай вобласці.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



АНЮХОЎСКІ
Анатолій Васільевіч

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву

Выбраны ад Віцебскай вобласці

Нарадзіўся 6 красавіка 1954 года ў вёсцы Леніна Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны-аграном.

Працаваў глебазнаўцам Віцебскай абласной станцыі па хімізацыі сельскай гаспадаркі, галоўным аграномам калгаса «Прагрэс», старшынёй калгаса «Гігант», галоўным аграномам міжгаспадарчага прадпрыемства па кормавытворчасці Дуброўенскага раёна Віцебскай вобласці, галоўным спецыялістам па кормавытворчасці ўпраўлення сельскай гаспадаркі Талачынскага раёна, галоўным аграномам калгаса імя Энгельса Талачынскага раёна, намеснікам старшыні па раслінаводству Талачынскага раённага аграпрамысловага аб'яднання Віцебскай вобласці, старшынёй Талачынскага раённага аб'яднання па аграхімічнаму абслугоўванню сельскай гаспадаркі «Сельгасхімія», старшынёй Талачынскага райвыканкама, дырэктарам унітарнага даччынага прадпрыемства «Талачынскі кансервавы завод» Віцебскага абласнога ўнітарнага прадпрыемства харчовай прамысловасці «Віцебскхарчпрам».

Дырэктар рэспубліканскага вытворчага даччынага ўнітарнага прадпрыемства «Талачынскі кансервавы завод».

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», сярэбраным медалём ВДНГ СССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам «Юбілейны медаль «У гонар 80-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».



АТРАШКЕВІЧ
Алена Віктараўна

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбрана ад Мінскай вобласці

Нарадзілася 29 сакавіка 1966 года ў горадзе Нова-Барысаве Мінскай вобласці. Закончыла Ленінградскую ордэна У.І.Леніна дзяржаўную кансерваторыю імя М.А.Рымскага-Корсакава, кампазітар, выкладчык.

Член грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз кампазітараў».

Старшыня прадметна-цыклавой камісіі «Мастацтва эстрады (спевы)» ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў», выкладчык музычна-тэарэтычных дысцыплін установы адукацыі «Маладзечанскае музычнае вучылішча імя М.К.Агінскага», кіраўнік узорнай студыі эстраднай песні «Спяваем разам».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Член савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, памятным знакам «2000 год Хрысціянству», Ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.



БАТУРА
Барыс Васільевіч

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2008 — 2010), член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню (з 2010)

Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

Нарадзіўся 28 ліпеня 1947 года ў горадзе Ваўкавыску Гродзенскай вобласці. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-тэхнолаг. Заслужаны работнік сферы абслугоўвання Рэспублікі Беларусь.

Працаваў майстрам цэха, інжынерам-тэхнолагам, выконваючым абавязкі начальніка аддзела тэхнічнага кантролю ўстановы УЖ-15/11 Гродзенскага аблвыканкама, начальнікам Ваўкавыскага камбіната камунальных прадпрыемстваў, намеснікам начальніка, начальнікам аддзела механікі і энергетыкі ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Гродзенскага аблвыканкама, намеснікам начальніка, першым намеснікам начальніка, начальнікам вытворчага ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі пры Гродзенскім аблвыканкаме. Быў намеснікам Міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларускай ССР, намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама, Міністрам жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь, Намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, старшынёй Магілёўскага аблвыканкама.

Назначаўся Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь адпаведна другога і трэцяга скліканняў.

Старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

Быў намеснікам Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Старшынёй Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, членам Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, членам Савета Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Магілёва».

Узнагароджаны ордэнамі Айчыны II і III ступені, «Знак Пашаны», «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалём «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава), дзвюма ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, ордэнам Беларускай праваслаўнай царквы Святіцеля Кірылы Тураўскага.



ДВОРНІК
Уладзімір Андрэевіч

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву

Выбраны ад Гомельскай вобласці

Нарадзіўся 16 красавіка 1963 года ў вёсцы Ровенская Слабада Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, ветэрынарны ўрач. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Працаваў трактарыстам калгаса імя Дзяржынскага Рэчыцкага раёна. Быў галоўным ветэрынарным урачом калгаса «Усход» Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці, намеснікам старшыні калгаса «Дружба» Мазырскага раёна Гомельскай вобласці, галоўным дзяржаўным ветэрынарным урачом Мазырскага раёна, дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Саўгас-камбінат «Зара» Мазырскага раёна, старшынёй Мазырскага райвыканкама.

Старшыня Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта.

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, ордэнам Рускай праваслаўнай царквы прападобнага Серафіма Сароўскага III ступені.



ДЗЮЖАЎ
Андрэй Анісімавіч

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Выбраны ад Гомельскай вобласці

Нарадзіўся 30 жніўня 1959 года ў горадзе Запарожжа, Украіна. Закончыў Запарожскі машынабудаўнічы інстытут, інжынер-механік. Член Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі, лаўрэат прэміі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Працаваў інжынерам-канструктарам аддзела агульнай кампаноўкі ўпраўлення галоўнага канструктара Волжскага аўтазавода, аддзела галоўнага канструктара вытворчага аб'яднання «Маторабудаўнік» горада Запарожжа, інжынерам-канструктарам, вядучым інжынерам-канструктарам — кіраўніком сектара, намеснікам загадчыка, загадчыкам канструктарска-даследчага аддзела дынамікі сістэм і трываласці канструкцый галаўнога спецыялізаванага канструктарскага бюро вытворчага аб'яднання «Гомсельмаш», намеснікам дырэктара рэспубліканскага канструктарскага ўнітарнага прадпрыемства «ГСКБ па збожжаўборачнай і кормаўборачнай тэхніцы» па навукова-даследчай працы — загадчыкам аддзела дынамікі, трываласці, аналітычнай надзейнасці і вылічальных сістэм.

Генеральны канструктар па збожжаўборачнай і кормаўборачнай тэхніцы Міністэрства прамысловасці Рэспублікі Беларусь — дырэктар рэспубліканскага канструктарскага ўнітарнага прадпрыемства «ГСКБ па збожжаўборачнай і кормаўборачнай тэхніцы».

Член прэзідыума Гомельскага філіяла Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па мытнаму рэгуляванню і пагранічнай палітыцы.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



ЕРМАКОВА
Надзея Андрэеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Выбрана ад Магілёўскай вобласці

Нарадзілася 19 красавіка 1953 года ў вёсцы Разульмоў Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст. Заслужаны эканаміст Рэспублікі Беларусь. Ганаровы работнік банкаўскай сістэмы Беларусі.

Працавала крэдытным інспектарам, старшым крэдытным інспектарам, намеснікам кіраўніка Хоцімскага аддзялення Дзяржбанка Магілёўскай вобласці, намеснікам кіраўніка Кіраўскага аддзялення Дзяржбанка Магілёўскай вобласці, кіраўніком Шклоўскага аддзялення Дзяржбанка Магілёўскай вобласці, намеснікам старшыні райвыканкама — старшынёй планавай камісіі, загадчыкам фінансавага аддзела Шклоўскага райвыканкама, кіраўніком філіяла камерцыйнага банка «Северо-Запад» у горадзе Шклове і кіраўніком аддзялення Белаграпрамбанка ў горадзе Шклове, намеснікам Старшыні Праўлення акцыянернага ашчаднага банка «Беларусбанк», Старшынёй Праўлення адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк».

Старшыня Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

Выбіралася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага, другога і трэцяга скліканняў.

Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз жанчын».

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы.

Член Нацыянальнага савета па гендэрнай палітыцы пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджана ордэнам Пашаны, юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалём «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава), дзвюма ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам «Юбілейны медаль «У гонар 80-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».



ЖОРАВА
Маргарыта Анатольеўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву

Выбрана ад Гомельскай вобласці

Нарадзілася 26 лютага 1956 года ў горадзе Навазыбкаве Бранскай вобласці РСФСР. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, юрыст; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання.

Працоўную дзейнасць пачала рабочай Навазыбкаўскага мясаптушкакамбіната. Працавала статыстыкам Навазыбкаўскага гаркама ВЛКСМ, дзяржаўным натарыусам першай Гомельскай дзяржаўнай натарыяльнай канторы, кансультантам, намеснікам начальніка ўпраўлення юстыцыі Гомельскага аблвыканкама.

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення юстыцыі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па заканадаўству і Рэгламенту.

Мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана ордэнам Пашаны, юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалём «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава), Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



ЗЯНЬКОЎ
Аляксандр Аляксандравіч

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбраны ад Віцебскай вобласці

Нарадзіўся 25 лютага 1977 года ў горадзе Віцебску. Закончыў Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт, урач-лячэбнік. Кандыдат медыцынскіх навук. Аўтар 57 навуковых прац, у тым ліку адной манаграфіі і чатырох рацыяналізатарскіх прапаноў.

Працаваў старшым лабарантам, асістэнтам кафедры шпітальнай хірургіі Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта, загадчыкам аддзялення таракальнай і сасудзістай хірургіі ўстановы аховы здароўя «Віцебская абласная клінічная бальніца».

Загадчык кардыяхірургічнага аддзялення ўстановы аховы здароўя «Віцебская абласная клінічная бальніца».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



КАРАЕД
Алена Аляксандраўна

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбрана ад Магілёўскай вобласці

Нарадзілася 6 чэрвеня 1966 года ў горадзе Мсціславе Магілёўскай вобласці. Закончыла Смаленскі дзяржаўны медыцынскі інстытут з адзнакай, урач-педыятр; вучыцца ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне сацыяльнай сферай».

Працавала ўчастковым урачом-педыятрам, раённым педыятрам, намеснікам галоўнага ўрача па медыцынскаму абслугоўванню насельніцтва раёна ўстановы аховы здароўя «Мсціслаўская цэнтральная раённая бальніца».

Галоўны ўрач установы аховы здароўя «Мсціслаўская цэнтральная раённая бальніца».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



КІЕВЕЦ
Іван Міхайлавіч

Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню

Выбраны ад Брэсцкай вобласці

Нарадзіўся 30 сакавіка 1952 года ў вёсцы Сулічава Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Ленінградскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга інстытут воднага транспарту, інжынер-гідратэхнік з правам выканання агульнабудаўнічых работ; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст. Заслужаны работнік транспарту Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым вышукальнай рэчышчавай партыі Днепра-Бугскага тэхнічнага ўчастка шляху. Працаваў фрэзероўшчыкам экскаватарарамонтнага завода, старшым рабочым, старшым тэхнікам, інжынерам, начальнікам вышукальнай рэчышчавай партыі, вызваленым старшынёй прафсаюзнага камітэта, старшым інжынерам, прарабам Днепра-Бугскага тэхнічнага ўчастка шляху, інструктарам Пінскага гаркама КПБ, вызваленым сакратаром пярвічнай партыйнай арганізацыі завода кавальска-прэсавых аўтаматычных ліній у горадзе Пінску, дырэктарам Пінскага камбіната надомнай працы, начальнікам Днепра-Бугскага тэхнічнага ўчастка шляху, дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага эксплуатацыйна-будаўнічага прадпрыемства «Днепра-Бугскі водны шлях».

Генеральны дырэктар рэспубліканскага ўнітарнага эксплуатацыйна-будаўнічага прадпрыемства «Днепра-Бугскі водны шлях».

Выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў 25-га склікання.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



КІСЯЛЁЎ
Уладзімір Аляксеевіч

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Выбраны ад Магілёўскай вобласці

Нарадзіўся 2 красавіка 1958 года ў вёсцы Харкаўка Чавускага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, інжынер-механік; Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, эканаміст-менеджар; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання.

Працоўную дзейнасць пачаў аўтаслесарам Багушэўскай міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў майстрам участка зборкі і зваркі кабін і апярэнняў Магілёўскага аўтамабільнага завода імя С.М.Кірава, механікам, майстрам дарогі дарожна-будаўнічага ўпраўлення № 37 у горадзе Касцюковічы, галоўным інжынерам — намеснікам начальніка аддзела па механізацыі, электрыфікацыі і матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню Касцюковіцкага раённага аграпрамыслова-га аб'яднання, інжынерам аддзела эксплуатацыі грузавой службы аўтамабільнага транспарту «Магілёўаблаўтатранс», намеснікам дырэктара па капітальнаму будаўніцтву — дырэктарам аўтапарка, які будаваўся, дырэктарам аўтапарка № 8 у горадзе Касцюковічы, дырэктарам Беларускага цэментнага завода.

Генеральны дырэктар вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Беларускі цэментны завод».

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



КОСІНЕЦ
Аляксандр Мікалаевіч

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

Нарадзіўся 27 мая 1959 года ў вёсцы Роскі-Сялец Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-лячэбнік; клініч-ную ардынатуру, аспірантуру, факультэт педагогікі і псіха-логіі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта; эканамічны факультэт (магістратуру) Беларускага дзяржаў-нага ўніверсітэта. Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Аўтар больш як 450 навуковых прац, у тым ліку 17 манаграфій і вучэб-ных дапаможнікаў, 8 вынаходстваў. Палкоўнік медыцынскай службы ў запасе.

Працаваў намеснікам сакратара, сакратаром камітэта камсамола Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Быў асістэнтам, дацэнтам, прафесарам кафедры шпітальнай хірургіі, прафесарам кафедры хірургіі факультэта павышэн-ня кваліфікацыі спецыялістаў Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кіраўніком рэспубліканскага навука-практычнага цэнтра «Інфекцыя ў хірургіі», рэктарам установы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт», Намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

Быў членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання з 15 лістапада 2004 года да 27 снежня 2005 года.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узна-гароджаны медалём «За працоўную доблесць», сямю юбілейнымі медалямі, нагрудным знакам «Выдатнік ахо-вы здароўя Рэспублікі Беларусь», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай гра-матай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, ордэнам Рускай праваслаўнай царквы прападобнага Сергія Рада-нежскага II ступені, ордэнамі «Карэцкі Крыж» II ступені, «За асабістыя заслугі», залатым медалём Альберта Швей-цара.



КРУПЕЦ
Леанід Фёдаравіч

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2010 – 2011), член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву (з 2011)

Выбраны ад Мінскай вобласці

Нарадзіўся 18 лістапада 1956 года ў вёсцы Макашы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Універсітэт Дружбы народаў імя П.Лумумбы, вучоны-аграном, перакладчык з іспанскай мовы.

Працаваў малодшым навуковым супрацоўнікам Беларускага навукова-даследчага інстытута аховы раслін, аграномам-тэхнолагам Гарадзейскага цукровага камбіната, інструктарам, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Нясвіжскага райкама КПБ, намеснікам старшыні Нясвіжскага раённага Савета дэпутатаў, першым намеснікам старшыні, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшынёй Нясвіжскага райвыканкама, першым намеснікам старшыні Мінскага аблвыканкама, памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па Віцебскай вобласці, старшынёй Мінскага аблвыканкама, намеснікам Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Быў членам Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню, намеснікам старшыні Савета па ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Бразілія.

Удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Нясвіжа».

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», пяццю юбілейнымі медалямі, дзвюма ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, ордэнам Беларускай праваслаўнай царквы Крыжа прападобнай Ефрасінні Полацкай, ордэнам Рускай праваслаўнай царквы прападобнага Сергія Раданежскага II ступені.



КРЫШТАПОВІЧ
Міхаіл Васільевіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы

Выбраны ад Мінскай вобласці

Нарадзіўся 22 красавіка 1956 года ў вёсцы Брылькі Валожынскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Кастрамскі тэхналагічны інстытут, інжынер-механік-тэхнолаг; Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, юрыст.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым Валожынскага масласырзавода Мінскай вобласці. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў вучнем слесара Валожынскага льнозавода. Быў майстрам кантрольна-вымяральных прыбораў і аўтаматыкі Крупскага льнозавода, галоўным інжынерам Валожынскага льнозавода, дырэктарам Нясвіжскага льнозавода, дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Нясвіжскі льнозавод».

Дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Гарадзейскі цукровы камбінат».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



КУІШ
Міхаіл Міхайлавіч

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву

Выбраны ад Брэсцкай вобласці

Нарадзіўся 25 лютага 1956 года ў горадзе Брэсце. Закончыў Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.С.Пушкіна, настаўнік фізікі.

Працоўную дзейнасць пачаў настаўнікам фізікі. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў інструктарам аддзела прапаганды і агітацыі, камісарам абласнога штаба студэнцкага будаўнічага атрада Брэсцкага абкама ЛКСМБ, сакратаром камітэта ЛКСМБ асобнай воінскай часці, арганізатарам пазашкольнай і пазакласнай работы сярэдняй школы № 11, дырэктарам сярэдняй школы № 18, дырэктарам сярэдняй школы № 32 горада Брэста, намеснікам старшыні Брэсцкага гарвыканкама.

Дырэктар установы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны каледж сувязі».

Дэпутат Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў.

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, нагрудным знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік адукацыі».



КУРЛОВІЧ
Аляксандр Мікалаевіч

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбраны ад Гродзенскай вобласці

Нарадзіўся 28 ліпеня 1961 года ў горадзе Гродна. Закончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, фізік, выкладчык. Заслужаны майстар спорту СССР па цяжкай атлетыцы. Заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту Рэспублікі Беларусь. Двухкратны алімпійскі чэмпіён па цяжкай атлетыцы (1988, 1992), чатырохкратны чэмпіён свету, двухкратны чэмпіён Еўропы, уладальнік Кубка свету, дванаццацікратны рэкардсмен свету.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў інструктарам па спорту добраахвотнага фізкультурна-спартыўнага таварыства прафсаюзаў, камітэта па фізічнай культуры і спорту, трэнерам-выкладчыкам па цяжкай атлетыцы ўстановы «Школа вышэйшага спартыўнага майстэрства» ўпраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама.

Выканаўчы дырэктар прадстаўніцтва НАК Беларусі ў Гродзенскай вобласці.

Член Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь. Член Выканаўчага камітэта Еўрапейскай Федэрацыі цяжкай атлетыкі, член Тэхнічнага камітэта Міжнароднай Федэрацыі цяжкай атлетыкі.

Удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Гродна». Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.



ЛАДУЦЬКА
Мікалай Аляксандравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню (з 2010)

Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

Нарадзіўся 21 сакавіка 1959 года ў горадзе Мінску. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-будаўнік; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання. Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь.

Працаваў майстрам, намеснікам сакратара, сакратаром камітэта камсамола будаўнічага ўпраўлення № 256 Мінскага вытворчага аб'яднання індустрыяльнага домабудавання (МВАІД), першым сакратаром Фрунзенскага райкама ЛКСМБ горада Мінска, намеснікам загадчыка аддзела камсамольскіх арганізацый Цэнтральнага камітэта ЛКСМБ, інструктарам арганізацыйнага аддзела Фрунзенскага райкама КПБ горада Мінска, начальнікам вытворча-тэхнічнага аддзела будаўнічага ўпраўлення № 256 МВАІД. Быў начальнікам аддзела інжынернай падрыхтоўкі, начальнікам вытворчага аддзела па будаўніцтву Мінскага арэнднага прадпрыемства індустрыяльнага домабудавання (МАПІД) «Мінскжылбуд», начальнікам будаўнічага ўпраўлення № 101 адкрытага акцыянернага таварыства «МАПІД» горада Мінска, дырэктарам камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама», кіраўніком адміністрацыі Фрунзенскага раёна горада Мінска, намеснікам старшыні, першым намеснікам старшыні, выконваючым абавязкі старшыні Мінскага гарвыканкама.

Старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



ЛАПАЦІНА
Ганна Люцыянаўна

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбрана ад Гомельскай вобласці

Нарадзілася 2 жніўня 1955 года ў вёсцы Гожа Гродзенскага раёна. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-лячэбнік.

Працавала ўрачом-інтэрнам тэрапеўтам Гомельскай абласной клінічнай бальніцы, участковым урачом-тэрапеўтам Калінкавіцкай і Навагрудскай раённых бальніц, участковым урачом-тэрапеўтам Гомельскай паліклінікі № 12, загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення, намеснікам галоўнага ўрача па медыцынскай частцы, галоўным урачом Гомельскай гарадской паліклінікі № 5.

Галоўны ўрач установы «Гомельскі абласны клінічны кардыялагічны дыспансер».

Старшыня пастаяннай камісіі Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў па сацыяльных пытаннях.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».



МАЗАЙ
Ніна Мікалаеўна

Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы

Выбрана ад горада Мінска

Нарадзілася 9 сакавіка 1950 года ў вёсцы Чалюшчавічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, гісторыя; Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС, гісторыя філасофіі. Мае дыпламатычны ранг Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачала настаўніцай гісторыі і грамадазнаўства Ракітніцкай школы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Працавала другім, першым сакратаром Жабінкаўскага райкама ЛКСМБ, сакратаром, першым сакратаром Брэсцкага абкама ЛКСМБ, першым сакратаром Цэнтральнага камітэта ЛКСМБ, Намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР, Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Французскай Рэспубліцы, па сумяшчальніцтву ў Іспаніі і Партугаліі, намеснікам Міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Паслом па асобных даручэннях Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Канадзе.

Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР адзінаццатага склікання.

Старшыня Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях знешняй палітыкі, член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па палітычных пытаннях і міжнароднаму супрацоўніцтву, намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй НАТА.

Старшыня савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Узнагароджана медалём «За працоўную адзнаку», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалём «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава), Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў БССР.



МАІСЕЕЎ
Леанід Сяргеевіч

Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню

Выбраны ад Магілёўскай вобласці

Нарадзіўся 23 красавіка 1950 года ў вёсцы Міхайлавічы Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут, заатэхнік. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў брыгадзірам будаўнічай брыгады, галоўным заатэхнікам калгаса «Перамога», дырэктарам саўгаса «Барок», старшынёй калгаса «Зара», дырэктарам закрытага акцыянернага таварыства «Зара» Магілёўскага раёна.

Генеральны дырэктар закрытага акцыянернага таварыства «Агракамбінат «Зара» Магілёўскага раёна.

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Дэпутат Магілёўскага раённага Савета дэпутатаў.

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй НАТА.

Поўны кавалер ордэна Айчыны, узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.



МАНЬКО
Наталля Віктараўна

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Выбрана ад Брэсцкай вобласці

Нарадзілася 26 ліпеня 1956 года ў вёсцы Цецеравец Клецкага раёна Мінскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст.

Працавала старшым бухгалтарам групы зводнага ўліку, эканамістам-бухгалтарам Брэсцкага абласнога вытворчага аб'яднання хлебапрадуктаў, старшым бухгалтарам, старшым эканамістам-бухгалтарам, галоўным эканамістам, намеснікам дырэктара па эканоміцы, бухгалтарскаму ўліку і кантролю Баранавіцкага камбіната хлебапрадуктаў, намеснікам дырэктара па эканоміцы, бухгалтарскаму ўліку і кантролю, выконваючым абавязкі дырэктара, дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Баранавіцкі камбінат хлебапрадуктаў».

Генеральны дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Баранавічхлебапрадукт».

Дэпутат Баранавіцкага гарадскога Савета дэпутатаў Брэсцкай вобласці.

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, ордэнам Беларускай праваслаўнай царквы Святой прападобнай Ефрасінні Полацкай. Удастоена ганаровага звання «Чалавек года «Баранавічы-2004». Пераможца рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2009» у намінацыі «За лідарства і паспяховае кіраўніцтва».



МАРОЗ
Лілія Францаўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву

Выбрана ад Мінскай вобласці

Нарадзілася 23 верасня 1956 года ў горадзе Мінску. Закончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, юрыст.

Працавала дзяржаўным натарыусам, старшым дзяржаўным натарыусам дзяржаўнай натарыяльнай канторы Заводскага раёна горада Мінска, старшым дзяржаўным натарыусам Першай Мінскай абласной дзяржаўнай натарыяльнай канторы, прыватным натарыусам, галоўным кансультантам, начальнікам аддзела прававога абслугоўвання грамадзян і арганізацый управаўлення юстыцыі Мінскага аблвыканкама, старшым дзяржаўным натарыусам дзяржаўнай натарыяльнай канторы № 2 Савецкага раёна горада Мінска.

Загадчык Першай Мінскай абласной дзяржаўнай натарыяльнай канторы.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па прававых пытаннях.

Узнагароджана ордэнам Пашаны, юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



МАРОЗ
Юрый Дзмітрыевіч

Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню

Выбраны ад Брэсцкай вобласці

Нарадзіўся 5 мая 1950 года ў вёсцы Замужанне Барысаўскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, інжынер-механік. Кандыдат эканамічных навук. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Працаваў інжынерам-механікам аддзела камплектацыі, старшым інжынерам, загадчыкам майстэрняў саўгаса-камбіната «Барысаўскі» Барысаўскага раёна, начальнікам аддзела камплектацыі па будаўніцтву жывёлагадоўчага комплексу «Аршанскі» Аршанскага раёна Віцебскай вобласці, дырэктарам дырэкцыі комплексу «Камянецкі», які будаваўся, Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці, дырэктарам саўгаса «Белавежскі» Камянецкага раёна, старшынёй камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню Брэсцкага аблвыканкама. Быў першым намеснікам Міністра, Міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, віцэ-прэзідэнтам адкрытага акцыянернага таварыства «Прыорбанк», дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Белавежскі» Камянецкага раёна.

Генеральны дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Белавежскі» Камянецкага раёна.

Член прэзідыума Камянецкага раённага Савета дэпутатаў.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па аграпрамысловай палітыцы, прыродакарыстанню і экалогіі.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, бронзавым медалём ВДНГ СССР, юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «100 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі», Граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



МАРТЫНАЎ
Мікалай Васільевіч

Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню

Выбраны ад Віцебскай вобласці

Нарадзіўся 1 жніўня 1957 года ў вёсцы Гудава Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання Камуністычнай партыі Беларусі, палітолаг, выкладчык сацыяльна-палітычных дысцыплін.

Працаваў памочнікам майстра па абслугоўванню круглапанчошнага абсталявання, намеснікам начальніка аддзела забеспячэння Віцебскай ордэна Леніна панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя КІМ. Быў экспертам камерцыйнага аддзела сумеснага савецка-заходнегерманскага прадпрыемства «Белвест», дырэктарам МКП «ЛМ + МК», генеральным дырэктарам ПКФ «ЛМ + МК», генеральным дырэктарам сумеснага беларуска-германскага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марка».

Генеральны дырэктар сумеснага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Марка».

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Член Савета па развіццю прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па вывучэнню вопыту дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага самакіравання, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Паўночным саветам.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «60 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



МІСЮРА
Раіса Аляксееўна

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбрана ад Брэсцкай вобласці

Нарадзілася 22 мая 1961 года ў горадзе Давыд-Гарадку Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла Ленінградскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга педыятрычны медыцынскі інстытут, урач-педыятр.

Працавала ўрачом-інтэрнам Валагодскай абласной дзіцячай бальніцы, участковым педыятрам Рэчыцкай амбулаторыі Столінскага раёна, намеснікам галоўнага ўрача па дзяцінству і родадапамозе Столінскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Намеснік галоўнага ўрача па медыцынскаму абслугоўванню сельскага насельніцтва і арганізацыйна-метадычнай працы ўстановы аховы здароўя «Столінская цэнтральная раённая бальніца».

Узнагароджана ордэнам Пашаны, юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



МОРАВА
Антаніна Пятроўна

Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбрана ад горада Мінска

Нарадзілася 27 ліпеня 1950 года ў сяле Грачанае Катоўскага раёна Валгаградскай вобласці РСФСР. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава з адзнакай, эканаміст; аспірантуру Інстытута эканомікі Акадэміі навук БССР; Інстытут эканамічнага развіцця Сусветнага банка па спецыяльнасці «Макраэканоміка». Доктар эканамічных навук, прафесар. Аўтар больш як 150 навуковых і вучэбна-метадычных прац.

Працавала ў Інстытуце эканомікі Акадэміі навук БССР, у БелНДІ НТІ і тэхніка-эканамічных даследаванняў Дзяржплана БССР, намеснікам кіраўніка групы саветнікаў Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, саветнікам-кансультантам, начальнікам эканамічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Была Міністрам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь (2001 — 2006), намеснікам дырэктара Інстытута дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Сустаршыня Беларускага саюза жанчын. Намеснік старшыні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці. Намеснік старшыні Нацыянальнага савета па гендэрнай палітыцы пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Загадчык секцыі па сацыяльных пытаннях экспертнага савета па праектах дзяржаўных праграм, створанага Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Член міжведамаснай камісіі па пытаннях інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь.

Намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях, член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па сацыяльнай палітыцы і правах чалавека, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», сямю юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дзвюма ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, граматамі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, Залатым медалём Маскоўскага дзяржаўнага сацыяльнага ўніверсітэта Расійскай Федэрацыі «За сацыяльнае служэнне» і Залатым ганаровым знакам імя Пятра Вялікага «За высакародную працу», нагрудным знакам «Юбілейны медаль «У гонар 80-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».



НАВІЦКІ
Генадзій Васільевіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню

Выбраны ад Магілёўскай вобласці

Нарадзіўся 2 студзеня 1949 года ў горадзе Магілёве. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-будаўнік; Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС.

Працаваў майстрам, начальнікам участка БУ-56, галоўным інжынерам БУ-92 будаўнічага трэста № 12 у горадзе Магілёве, інструктарам аддзела будаўніцтва Магілёўскага абкама, галоўным інжынерам Магілёўскага аблміжкалгасбуда, загадчыкам аддзела будаўніцтва Магілёўскага абкама, старшынёй праўлення Магілёўскага аблсельбуда, Міністрам архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь, Намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся Старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па эканамічнай палітыцы, член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па эканамічнай палітыцы, член Кантрольна-бюджэтнай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па пытаннях абароны і бяспекі, кіраўнік дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва.

Намеснік старшыні Савета па ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалём «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава), Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



НАВУМЧЫК
Ала Аляксандраўна

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы

Выбрана ад Гомельскай вобласці

Нарадзілася 24 снежня 1960 года ў пасёлку Вясёлы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыла Гомельскі кааператыўны інстытут Цэнтрасаюза, эканаміст; Львоўскі гандлёва-эканамічны інстытут, эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай. Кандыдат эканамічных навук, дацэнт.

Працавала эканамістам па комплекснай сістэме кіравання якасцю працы Гомельскага райспажыўсаюза, старшым эканамістам, малодшым навуковым супрацоўнікам па гаспадарча-дагаворнай тэме, асістэнтам кафедры эканомікі гандлю Гомельскага кааператыўнага інстытута. Пасля заканчэння аспірантуры Львоўскага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта была асістэнтам, старшым выкладчыкам кафедры эканомікі гандлю, загадчыкам кафедры эканомікі і кіравання ў аграпрамысловым комплексе, прарэктарам па навуковай працы Гомельскага кааператыўнага інстытута, першым прарэктарам установы адукацыі «Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі».

Рэктар установы адукацыі «Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі».

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па інфармацыйнай палітыцы, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Старшыня Гомельскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь». Старшыня грамадскага аб'яднання «Клуб дзелавых жанчын горада Гомеля».

Узнагароджана медалём «За працоўную адзнаку», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалём «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава), Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



НОВІКАЎ
Анатолій Мікалаевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбраны ад Мінскай вобласці

Нарадзіўся 13 лютага 1941 года ў горадзе Бароўску Калужскай вобласці РСФСР. Закончыў Маскоўскае вышэйшае агульнавайсковае камандное вучылішча імя Вярхоўнага Савета РСФСР, агульнавайсковы камандзір; Ваенна-палітычную акадэмію імя У.І.Леніна, палітработнік; Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС, палітолаг. Генерал-лейтэнант у адстаўцы.

Працаваў на розных пасадах у Маскоўскай, Прыбалтыйскай і Прыкарпацкай ваенных акругах, Групе савецкіх войскаў у Германіі. Быў членам ваеннага савета танкавай арміі ў горадзе Барысаве, членам ваеннага савета Закаўказскай і Беларускай ваенных акруг, начальнікам інспекцыі Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР адзінаццатага склікання, дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання — старшынёй Пастаяннай камісіі па пытаннях нацыянальнай бяспекі, абароны і барацьбы са злачыннасцю, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання — старшынёй Пастаяннай камісіі па сацыяльных пытаннях, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — старшынёй Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях.

Старшыня Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па пытаннях абароны і бяспекі, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй НАТА.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені, Пашаны, Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, дваццаць адным медалём, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва. Мае Падзяку Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.



ПАДАЛЯК
Алена Міхайлаўна

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбрана ад Віцебскай вобласці

Нарадзілася 12 сакавіка 1962 года ў горадзе Оршы Віцебскай вобласці. Закончыла Мінскі інстытут культуры, культасветработнік, кіраўнік самадзейнага харавога калектыву; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання сацыяльнай сферай.

Працавала метадыстам Гарадоцкага раённага Дома культуры, хормайстрам, хормайстрам дзіцячага ансамбля песні і танца «Камарыкі» Палаца культуры вытворчага аб'яднання «Навапалацкнафтааргсінтэз», выкладчыкам прадметаў харавога цыкла Віцебскага культурна-асветнага вучылішча, выкладчыкам кафедры музычнага выхавання Віцебскага педагагічнага інстытута імя С.М.Кірава, хормайстрам, дырэктарам вакальна-харэаграфічнага ансамбля «Талака».

Дырэктар дзяржаўнай канцэртнай установы «Віцебская абласная філармонія».

Намеснік старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па культуры, інфармацыі, турызму і спорту, намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя.

Член савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ПАПОЎ
Вадзім Аляксандравіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Выбраны ад горада Мінска

Нарадзіўся 5 ліпеня 1940 года ў горадзе Дзямідаве Смаленскай вобласці РСФСР. Закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, інжынер-механік; Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працоўную дзейнасць пачаў рабочым у саўгасе «Бацішчаўскі» Смаленскай вобласці. Працаваў брыгадзірам, механікам саўгаса ў Алтайскім краі. Служыў у радах Узброеных Сіл. Выкладаў у прафесійна-тэхнічным вучылішчы ў горадзе Крычаве. Быў на камсамольскай рабоце, працаваў дырэктарам саўгаса імя Калініна Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці, інструктарам Магілёўскага абкама КПБ, інструктарам Цэнтральнага камітэта КПБ, першым сакратаром Асіповіцкага гаркама КПБ, загадчыкам аддзела, другім і першым сакратаром Магілёўскага абкама КПБ, затым — на гаспадарчай рабоце, узначальваў розныя службы аграпрамысловага комплексу вобласці. Займаў пасады першага намесніка Міністра, Міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь.

З'яўляўся Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання, выбіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання — старшынёй Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД (2004 — 2007), Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2007 — 2008).

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях знешняй палітыкі, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па эканоміцы і фінансах, член Пастаяннай камісіі Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы па сацыяльна-эканамічных і прававых пытаннях, член міжведамаснай камісіі па бяспецы ў эканамічнай сферы пры Савеце Бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Садружнасць» (Міжпарламенцкая Асамблея дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў), шаснаццаццю медалямі, васямнаццаццю ганаровымі граматамі і падзякамі дзяржаўных органаў і міжнародных арганізацый.



ПАРАХНЕВІЧ
Ірына Міхайлаўна

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Выбрана ад Мінскай вобласці

Нарадзілася 24 лютага 1955 года ў вёсцы Канюхі Лагойскага раёна Мінскай вобласці. Закончыла Гомельскі кааператыўны інстытут Цэнтрасаюза, таваразнаўца.

Працавала таваразнаўцам аптовай базы, таваразнаўцам Лагойскага раённага спажывецкага таварыства, дырэктарам Гайненскага рознічна-гандлёвага прадпрыемства Лагойскага раёна, дырэктарам гандлёвай базы, дырэктарам аптова-гандлёва-закупачнай базы Лагойскага райспажыўтаварыства, начальнікам аддзела закупкі і рэалізацыі, дырэктарам камбіната кааператыўнай прамысловасці Лагойскага райспажыўтаварыства Мінскай вобласці.

Старшыня праўлення Лагойскага раённага спажывецкага таварыства.

Унесена ў Кнігу гонару Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў спажывецкай кааперацыі.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «100 гадоў прафсаюзнаму руху Беларусі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік спажывецкай кааперацыі».



ПАТУПЧЫК
Уладзімір Мікалаевіч

Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі
Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (з 2011)

Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

Нарадзіўся 17 лістапада 1958 года ў горадзе Светлагорску Гомельскай вобласці. Закончыў Беларускі політэхнічны інстытут, інжынер-цеплаэнергетык; Расійскую акадэмію дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі, менеджар.

Працаваў машыністам-абходчыкам турбіннага абсталявання Мазырскай ЦЭЦ, машыністам турбін, начальнікам змены Светлагорскай ЦЭЦ, намеснікам начальніка цэнтральнай службы раённага энергетычнага ўпраўлення «Гомельэнерга», начальнікам лабараторыі металаў Светлагорскай ЦЭЦ. Быў інструктарам арганізацыйнага аддзела, загадчыкам прамыслова-транспартнага аддзела, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Светлагорскага гаркама КПБ, намеснікам старшыні Светлагорскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, намеснікам старшыні, першым намеснікам старшыні Светлагорскага гарвыканкама, старшынёй камітэта па эканоміцы і рыначных адносінах Гомельскага аблвыканкама, старшынёй Мазырскага гарвыканкама, намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама. Займаў пасады памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўнага інспектара па гораду Мінску, Міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, Намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



ПАЎЛАЎ
Міхаіл Якаўлевіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах
і нацыянальнай бяспецы (31.10.2008 – 06.06.2010)

Выбраны ад горада Мінска

Нарадзіўся 1 верасня 1952 года ў вёсцы Ордаць Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, інжынер-механік; Акадэмію народнай гаспадаркі пры Урадзе Расійскай Федэрацыі, менеджар вышэйшай кваліфікацыі. Кандыдат тэхнічных навук. Аўтар 13 навуковых прац, 4 вынаходстваў. Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

Працаваў электразваршчыкам магілёўскага завода «Будмашына» імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, электразваршчыкам Валожынскай міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі «Міжкалгасбуд». Служыў у радах Узброеных Сіл. Быў электразваршчыкам, старшым майстрам, інжынерам-тэхнолагам, начальнікам аддзела тэхнічнага кантролю, галоўным інжынерам, дырэктарам завода сянажных вежаў Баранавіцкага камбіната сянажных вежаў Брэсцкай вобласці, генеральным дырэктарам Беларускага вытворчага аб'яднання гандлёвага машынабудавання (г. Баранавічы), старшынёй Баранавіцкага гарвыканкама, старшынёй Мінскага гарвыканкама.

Назначаўся Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь адпаведна другога і трэцяга скліканняў.

Удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Мінска».

Меў дзве падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, падзяку Прэзідэнта Украіны. Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені, Пашаны, юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, ордэнамі Рускай праваслаўнай царквы Святога роўнаапостальнага Вялікага князя Уладзіміра II ступені, прападобнага Сергія Раданежскага III ступені, міжнароднай узнагародай «Факел Бірмінгема».

Памёр 6 чэрвеня 2010 года.



ПЕСЦІС
Вітольд Казіміравіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах
і нацыянальнай бяспецы

Выбраны ад Гродзенскай вобласці

Нарадзіўся 22 лютага 1949 года ў вёсцы Парэчча Гродзенскага раёна. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны-заатэхнік; аспірантуру Беларускага навукова-даследчага інстытута жывёлагадоўлі. Доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар. Член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. Ганаровы прафесар Міжнароднага Венскага ўніверсітэта. Аўтар больш як 300 навуковых і вучэбна-метадычных артыкулаў, 20 вучэбных дапаможнікаў, 9 манаграфій і 60 вынаходстваў.

Падрыхтаваў 17 кандыдатаў і дактароў навук.

Працоўную дзейнасць пачаў заатэхнікам-селекцыянерам Гродзенскай абласной станцыі па племянной працы ў свінагадоўлі. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў галоўным заатэхнікам саўгаса «Скідзельскі», калгаса «Сцяг камунізму» Гродзенскага раёна. Пасля заканчэння аспірантуры быў малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела кармлення Беларускага навукова-даследчага інстытута жывёлагадоўлі, асістэнтам, дацэнтам, загадчыкам кафедры кармлення і фізіялогіі сельскагаспадарчых жывёл, прарэктарам па навуковай працы, рэктарам Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута.

Рэктар установы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт».

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў.

Намеснік старшыні рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь».

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па палітычных пытаннях і міжнароднаму супрацоўніцтву.

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, дзевяццю юбілейнымі медалямі, дзвюма ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дзвюма ганаровымі граматамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Ганаровай граматай Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, ганаровымі граматамі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.



ПРАНЮК
Віктар Францавіч

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву

Выбраны ад Гродзенскай вобласці

Нарадзіўся 30 красавіка 1973 года ў вёсцы Пескі Лідскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, настаўнік фізікі і інфарматыкі.

Працаваў настаўнікам фізікі і інфарматыкі агульнаадукацыйнай школы № 11, дырэктарам агульнаадукацыйнай школы № 3 горада Ліды.

Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Агульнаадукацыйны ліцэй № 1 г. Ліда».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Паўночным саветам, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» і Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



РАБЕЦ
Валерый Васільевіч

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Выбраны ад Віцебскай вобласці

Нарадзіўся 15 чэрвеня 1951 года ў вёсцы Порплішча Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-механік; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, менеджар-эканаміст.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў механікам упраўлення механізацыі № 141 трэста № 16 «Нафтабуд» у горадзе Наваполацку. Пасля работы ў Мангольскай Народнай Рэспубліцы з'яўляўся старшынёй прафкама ўпраўлення механізацыі № 141 трэста № 16 «Нафтабуд». Быў начальнікам аддзела тэхнікі бяспекі трэста № 16 «Нафтабуд», галоўным інжынерам, дырэктарам завода жалезабетонных вырабаў трэста № 16 «Нафтабуд», дырэктарам дзяржаўнага прадпрыемства «Наваполацкжалезабетон».

Дырэктар вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Наваполацкжалезабетон».

Дэпутат Наваполацкага гарадскога Савета дэпутатаў.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па бюджэту і фінансах.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», медалём «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава), Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь, нагруднымі знакамі «За заслугі ў будаўніцтве», «Ганаровы будаўнік».



РАІНЧЫК
Ірына Анатольеўна

Член Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву

Выбрана ад Магілёўскай вобласці

Нарадзілася 16 красавіка 1973 года ў горадзе Магілёве. Закончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А.Куляшова, выхавацель; Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Куляшова, псіхолаг; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, ідэолаг.

Працавала выхавацелем, загадчыкам ясляў-сада № 36 Магілёўскага аўтамабільнага завода імя С.М.Кірава, загадчыкам санаторнага ясляў-сада № 36 аддзела адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна горада Магілёва.

Начальнік аддзела ідэалагічнай работы адміністрацыі Кастрычніцкага раёна горада Магілёва.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па інфармацыйнай палітыцы.

Член Савета па ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Член прэзідыума Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



РУБІНАЎ
Анатолій Мікалаевіч

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (з 2010),
Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (2008 — 2010)

Выбраны ад горада Мінска

Нарадзіўся 15 красавіка 1939 года ў горадзе Магілёве. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, фізік. Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, член Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Аўтар больш як 300 навуковых прац, чатырох манаграфій і 65 вынаходстваў. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны арыгінальныя лазерныя прыборы, адзначаныя дыпломамі і медалямі ВДНГ СССР і ўдастоеныя залатога медаля Міжнароднага Лейпцыгскага кірмашу.

Падрыхтаваў больш як 30 кандыдатаў і дактароў навук.

Працоўную дзейнасць пачаў у Інстытуце фізікі Акадэміі навук БССР. Прайшоў шлях ад аспіранта да намесніка дырэктара па навуковай працы Інстытута фізікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выконваў абавязкі акадэміка-сакратара аддзялення фізікі, матэматыкі і інфарматыкі Акадэміі навук БССР. Узначальваў Вышэйшую атэстацыйную камісію Рэспублікі Беларусь. Быў Першым намеснікам Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Член Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Член Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь. Старшыня Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь.

Намеснік Старшыні Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, намеснік Старшыні Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, член Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў, член Савета Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

Старшыня Савета па ўзаемадзеянню органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны, юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



РУДНІК
Пётр Міхайлавіч

Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню

Выбраны ад Магілёўскай вобласці

Нарадзіўся 14 красавіка 1957 года ў вёсцы Аляксееўка Брагінскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Дрэздэнскі тэхнічны ўніверсітэт, інжынер-электрык; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне дзяржаўнага кіравання.

Працоўную дзейнасць пачаў тэхнікам канструктарскага бюро дакладнага электроннага машынабудавання. Служыў у радах Узброеных Сіл. Быў слухачом падрыхтоўчага аддзялення Мінскага радыётэхнічнага інстытута. Працаваў інжынерам-канструктарам, інжынерам-электронікам другой катэгорыі спецыяльнага канструктарскага бюро тэхналагічнага абсталявання ў горадзе Магілёве. Быў вучнем муляра-мантажніка, бетоншчыкам будаўнічага ўпраўлення № 44 будаўнічага трэста № 12 горада Магілёва. Працаваў інжынерам-электронікам першай катэгорыі спецыяльнага канструктарскага бюро тэхналагічнага абсталявання вытворчага аб'яднання «Тэхнаприбор», вядучым інжынерам па знешнегандлёвых адносінах, намеснікам дырэктара па быту, рэжыму і сацыяльных пытаннях Магілёўскага ліфтабудаўнічага завода, намеснікам дырэктара, генеральным дырэктарам рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Магілёўскі завод ліфтавага машынабудавання».

Старшыня Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



РЭВЯКА
Васілій Афанасьевіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы

Выбраны ад Гродзенскай вобласці


Нарадзіўся 15 ліпеня 1948 года ў вёсцы Рабец Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны-заатэхнік; Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС, палітолаг, выкладчык сацыяльна-палітычных дысцыплін. Кандыдат сельскагаспадарчых навук. Герой Беларусі. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Працоўную дзейнасць пачаў заатэхнікам-селекцыянерам калгаса «Заазер'е» Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў загадчыкам цэха жывёлагадоўлі, намеснікам старшыні калгаса «Прагрэс» Гродзенскага раёна, інструктарам арганізацыйнага аддзела Гродзенскага абкама КПБ, першым сакратаром Мастоўскага райкама КПБ.

Старшыня сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Прагрэс-Верцялішкі» Гродзенскага раёна.

Дэпутат Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «60 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



САКАЛОЎСКАЯ
Людміла Карнееўна

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Выбрана ад Мінскай вобласці

Нарадзілася 10 сакавіка 1954 года ў горадзе Барысаве Мінскай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачала аператарам Барысаўскай гарадской машыналічыльнай станцыі. Працавала інспектарам, інжынерам па нарміраванню, эканамістам па працы, старшым эканамістам па працы, начальнікам бюро, намеснікам начальніка, начальнікам планавага аддзела, начальнікам планава-эканамічнага ўпраўлення, выконваючым абавязкі намесніка дырэктара па эканамічных пытаннях, намеснікам генеральнага дырэктара барысаўскага завода «Аўтагідраўзмацняльнік», начальнікам планава-эканамічнага аддзела, начальнікам упраўлення эканомікі працы і заработнай платы, выконваючым абавязкі намесніка генеральнага дырэктара па эканоміцы адкрытага акцыянернага таварыства «Барысаўскі завод аўтатрактарнага электраабсталявання».

Намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы адкрытага акцыянернага таварыства «Барысаўскі завод аўтатрактарнага электраабсталявання».

Узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь.



САЎЧАНКА
Уладзімір Ягоравіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы (2008 — 2010)

Выбраны ад Гродзенскай вобласці

Нарадзіўся 26 лютага 1952 года ў вёсцы Фралоўка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, інжынер-землеўпарадчык.

Працоўную дзейнасць пачаў выкладчыкам Брасаўскага сельскагаспадарчага тэхнікума Бранскай вобласці. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў прарабам, начальнікам Круглянскага дарожна-эксплуатацыйнага ўчастка № 214 Магілёўскага абласнога вытворчага ўпраўлення будаўніцтва і эксплуатацыі аўтамабільных дарог, старшынёй калгаса «Шлях камунізму» Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці, старшынёй Круглянскага райвыканкама, намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама, першым намеснікам старшыні, старшынёй Гродзенскага аблвыканкама.

Назначаўся Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь адпаведна другога і трэцяга скліканняў.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыны III ступені, Пашаны, медалём «За працоўную адзнаку», трыма юбілейнымі медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Згодна з пададзенай заявай паўнамоцтвы члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь датэрмінова спынены з 9 сакавіка 2010 года.



СКАКУН
Аляксей Сцяпанавіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы

Выбраны ад Брэсцкай вобласці

Нарадзіўся 1 сакавіка 1946 года ў вёсцы Дастоева Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны-заатэхнік. Доктар эканамічных навук, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук, акадэмік Міжнароднай акадэміі арганізацыйных і кіраўніцкіх навук, акадэмік Беларускай і Міжнароднай інжынерных акадэмій. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь. Аўтар 6 навуковых прац, 5 кніг.

Працоўную дзейнасць пачаў заатэхнікам калгаса «Чырвоная Зорка» Іванаўскага раёна. Пасля службы ў радах Узброеных Сіл працаваў галоўным заатэхнікам, намеснікам старшыні калгаса «Маладая гвардыя», старшынёй калгаса «Дружба» Іванаўскага раёна, намеснікам старшыні Іванаўскага райвыканкама — начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання, старшынёй калгаса-камбіната «Памяць Ільіча» Брэсцкага раёна.

Старшыня сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Астрамечава» Брэсцкага раёна.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР адзінаццатага скліканння, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў.

Дэпутат Брэсцкага раённага Савета дэпутатаў.

Старшыня грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі аграпрамысловы саюз» і «Беларускі сялянскі савет».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалём «За працоўную адзнаку», юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», двума сярэбранымі медалямі ВДНГ СССР, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



СКАРАБАГАТАЎ
Віктар Іванавіч

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Выбраны ад Гомельскай вобласці

Нарадзіўся 28 сакавіка 1958 года ў горадзе Гомелі. Закончыў Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічны інстытут, інжынер-электрык.

Працоўную дзейнасць пачаў падсобна-транспартным рабочым Марыйскага аддзялення Сярэднеазіяцкай чыгункі. Быў памочнікам машыніста кампрэсарных установак. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў электрамеханікам па ліфтах, майстрам, начальнікам участка № 8 Гомельскага завода вымяральных прыбораў, інжынерам-энергетыкам механізаванай калоны № 163 трэста «Захбамбудмеханізацыя», галоўным інжынерам жыллёва-камунальнай канторы аб'яднання «Гомельпрамбуд», галоўным энергетыкам арэнднага вытворчага будаўніча-мантажнага аб'яднання «Гомельпрамбуд», галоўным энергетыкам рэспубліканскага даччынага аўтатранспартнага ўнітарнага прадпрыемства «Аўтобусны парк № 1» горада Гомеля, галоўным энергетыкам адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельскі аўтобусны парк № 1».

Галоўны механік адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельскі аўтобусны парк № 1».

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.» і «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



СМІРНОЎ
Яўгеній Аляксандравіч

Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву

Выбраны ад горада Мінска

Нарадзіўся 15 сакавіка 1949 года ў горадзе Ражску Разанскай вобласці РСФСР. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, юрыст. Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь.

Служыў у радах Узброеных Сіл. Быў майстрам, начальнікам бюро працы і заработнай платы Мінскага электрамеханічнага завода. Выбіраўся народным суддзёй, старшынёй суда Першамайскага раёна горада Мінска. Працаваў суддзёй Мінскага гарадскога суда, начальнікам упраўлення судовых органаў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, намеснікам, першым намеснікам Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь.

Намеснік старшыні Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па заканадаўству і Рэгламенту, намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



СУМАР
Канстанцін Андрэевіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы

Выбраны ад Брэсцкай вобласці

Нарадзіўся 15 студзеня 1949 года ў вёсцы Вічын Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут, вучоны-аграном; Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працаваў загадчыкам Дварэцкага сельскага клуба, інжынерам-гідрамеліяратарам, галоўным аграномам, намеснікам старшыні калгаса «Шлях Леніна», старшынёй калгаса «Рассвет» Лунінецкага раёна, першым намеснікам старшыні выканаўчага камітэта Лунінецкага раённага Савета народных дэпутатаў, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі. Быў выбраны другім і першым сакратаром Брэсцкага райкама КПБ, старшынёй Брэсцкага раённага Савета народных дэпутатаў, старшынёй Брэсцкага райвыканкама, старшынёй Брэсцкага раённага Савета дэпутатаў. Займаў пасады намесніка Начальніка Службы кантролю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, намесніка Старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, першага намесніка старшыні Мінскага аблвыканкама, Старшыні Дзяржаўнага падатковага камітэта Рэспублікі Беларусь, Міністра па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За працоўную доблесць», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.



СЯЎКО
Людміла Раманаўна

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбрана ад Гродзенскай вобласці

Нарадзілася 30 лістапада 1956 года ў горадзе Гродна. Закончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы, настаўнік пачатковых класаў; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І.Леніна, выкладчык англійскай мовы.

Працавала фактурыстам склада на базе «Аблкаапгасганлю», камплектоўшчыцай інструменту рамонтна-механічнага цэха Гродзенскага хімічнага камбіната, кладаўшчыцай вяслярнай базы, зброевым майстрам Гродзенскага абласнога савета «Дынама». Была трэнерам-выкладчыкам па кулявой стральбе Гродзенскага абласнога савета «Дынама» і дзіцячай юнацкай спартыўнай школы № 1 Ленінскага раённага аддзела народнай адукацыі горада Гродна, настаўніцай пачатковых класаў і англійскай мовы сярэдняй школы № 26 Кастрычніцкага раённага аддзела адукацыі горада Гродна, намеснікам старшыні Гродзенскай гарадской арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

Старшыня Гродзенскай гарадской арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

Выбіралася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Намеснік старшыні Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па сацыяльнай палітыцы.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва.



ТАЛКАЧОЎ
АнатоліЙ Васільевіч

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльнаму развіццю

Выбраны ад горада Мінска

Нарадзіўся 1 жніўня 1949 года ў горадзе Мінску. Закончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-лячэбнік.

Працаваў урачом-інтэрнам па хірургіі, урачом-хірургам 9-й клінічнай бальніцы горада Мінска, клінічным ардынатарам кафедры хірургічных хвароб Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Быў старшынёй прафсаюзнага камітэта 9-й клінічнай бальніцы горада Мінска.

Галоўны ўрач установы аховы здароўя «Мінскі кансультацыйна-дыягнастычны цэнтр».

Член прэзідыума Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



УЦЮПІН
Павел Уладзіміравіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы

Выбраны ад Магілёўскай вобласці

Нарадзіўся 17 снежня 1976 года ў сяле Папоўка Харольскага раёна Прыморскага края РСФСР. Закончыў Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, эканаміст, магістр эканамічных навук; Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, спецыяліст у галіне міжнародных адносін.

Працаваў намеснікам дырэктара па знешнеэканамічных сувязях малога прадпрыемства «Дубль В», начальнікам аддзела знешнеэканамічных сувязей вытворча-камерцыйнай фірмы «УТВ», эканамістам планава-эканамічнага аддзела сумеснага прадпрыемства «Фрэбор» у горадзе Барысаве. Пасля заканчэння аспірантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта быў саветнікам, галоўным саветнікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама.

Намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы і фінансах адкрытага акцыянернага таварыства «Белшына».

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі Еўразійскага эканамічнага супольніцтва па гандлёвай палітыцы і міжнароднаму супрацоўніцтву, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Узнагароджаны юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ХМАРЫК
Раіса Міхайлаўна

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах

Выбрана ад Гродзенскай вобласці

Нарадзілася 9 чэрвеня 1960 года ў вёсцы Верхлессе Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыла Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст.

Працоўную дзейнасць пачала бухгалтарам магілёўскай базы «Гандальбадзенне». Працавала бухгалтарам Слонімскага раённага спажывецкага саюза, бухгалтарам, намеснікам галоўнага бухгалтара, галоўным бухгалтарам Слонімскага кардонна-папяровага завода, намеснікам генеральнага дырэктара па эканоміцы адкрытага акцыянернага таварыства «Слонімскі кардонна-папяровы завод «Альбярцін».

Намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы і фінансах адкрытага акцыянернага таварыства «Слонімскі кардонна-папяровы завод «Альбярцін».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у Міжпарламенцкай асамблеі праваслаўя.

Узнагароджана юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ЧУЙКО
Рыгор Пятровіч

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню

Выбраны ад Мінскай вобласці

Нарадзіўся 26 верасня 1959 года ў вёсцы Івашня Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны-аграном.

Працаваў брыгадзірам комплекснай брыгады калгаса «Камінтэрн», старшынёй праўлення калгаса імя У.І.Леніна Магілёўскага раёна. Быў старшым дыспетчарам — намеснікам дырэктара па аператыўнай рабоце саўгаса «Ждановіцкі цяплічны камбінат», намеснікам дырэктара па аператыўнаму кіраванню — старшым дыспетчарам, намеснікам генеральнага дырэктара па вытворчасці, генеральным дырэктарам аграгандлёвай фірмы «Ждановічы» Мінскага раёна.

Генеральны дырэктар Мінскага раённага ўнітарнага прадпрыемства «Агракамбінат «Ждановічы».

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Дэпутат Мінскага раённага Савета дэпутатаў.

Член Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў па аграрнай палітыцы, прыродных рэсурсах і экалогіі, намеснік кіраўніка дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Узнагароджаны ордэнам Пашаны, юбілейнымі медалямі «90 год Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь», «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.



ШАКУЦІН
Аляксандр Васільевіч

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах
і нацыянальнай бяспецы (2008–2010),
намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах
і нацыянальнай бяспецы (з 2010)
Выбраны ад горада Мінска

Нарадзіўся 12 студзеня 1959 года ў вёсцы Вялікае Бабіна Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Закончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, урач-лячэбнік.

Працоўную дзейнасць пачаў трактарыстам калгаса «Радзіма» Аршанскага раёна. У час вучобы ў Мінскім дзяржаўным медыцынскім інстытуце быў намеснікам сакратара камітэта камсамола інстытута, камандзірам-інструктарам занальных студэнцкіх будаўнічых штабоў Мінскага абкама камсамола. Працаваў інструктарам, галоўным урачом Рэспубліканскага студэнцкага атрада — загадчыкам сектара Цэнтральнага камітэта ЛКСМБ. Прайшоў інтэрнатуру ў 4-й Мінскай гарадской клінічнай бальніцы. Пасля заканчэння клінічнай ардынатуры Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута па спецыяльнасці «Хірургія» быў загадчыкам 1-га хірургічнага аддзялення 10-й Мінскай гарадской клінічнай бальніцы, галоўным урачом медсанчасці, дырэктарам медыцынскага цэнтра Мінскага ордэна Леніна і ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі трактарнага завода. Быў прэзідэнтам Міжнароднай медыцынскай асацыяцыі «Здароўе і прыгажосць», прэзідэнтам навукова-вытворчага аб'яднання «Праммедінвест» (г. Мінск), генеральным дырэктарам закрытага акцыянернага таварыства «Праммедінвест».

Намеснік генеральнага дырэктара па пытаннях перспектыўнага развіцця закрытага акцыянернага таварыства «Праммедінвест», старшыня савета дырэктараў адкрытага акцыянернага таварыства «Амкадор».

Член прэзідыума рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай канферэнцыяй Балтыйскага мора.

Мае Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.



ШАПІРА
Сямён Барысавіч

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэту і фінансах (з 2010)
Назначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь

Нарадзіўся 17 чэрвеня 1961 года ў вёсцы Рэчань Любанскага раёна Мінскай вобласці. Закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В.У.Куйбышава, эканаміст. Доктар эканамічных навук, прафесар.

Працаваў галоўным эканамістам, намеснікам дырэктара па вытворчасці саўгаса «Камсамолец» Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння аспірантуры Беларускага навукова-даследчага інстытута эканамічных праблем быў старшынёй калгаса «Маяк», старшынёй сельскагаспадарчага калектыўнага прадпрыемства «Маяк» Дзяржынскага раёна. Закончыў дактарантуру Беларускага навукова-даследчага інстытута эканомікі і інфармацыі аграпрамысловага комплексу. З'яўляўся начальнікам галоўнага ўпраўлення эканомікі, дырэктарам дэпартамента эканомікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь, дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Дзяржынская бройлерная птушкафабрыка», дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «Агракамбінат «Дзяржынскі» Мінскай вобласці. Займаў пасаду Міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

Узнагароджаны юбілейным медалём «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.



ШАРЭЙКА
Ганна Васільеўна

Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы
Выбрана ад Віцебскай вобласці

Нарадзілася 15 студзеня 1960 года ў вёсцы Антаполле Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці. Закончыла Віцебскі ветэрынарны інстытут, ветэрынарны ўрач; Усерасійскі навукова-даследчы і тэхналагічны інстытут птушкагадоўлі, навуковая заатэхнія. Кандыдат сельскагаспадарчых навук.

Працоўную дзейнасць пачала рабочай саўгаса «Слідчаны» Чашніцкага раёна. Была рабочай Віцебскай перасоўнай механізаванай калоны рэспубліканскага аб'яднання «Белсельгастэхніка». Працавала аператарам, начальнікам цэха інкубацыі, галоўным тэхнолагам — намеснікам дырэктара па вытворчасці, дырэктарам Віцебскай бройлернай птушкафабрыкі.

Генеральны дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Віцебская бройлерная птушкафабрыка».

Член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ажыццяўленню кантактаў з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы.

Узнагароджана ордэнам Пашаны, медалём «За працоўныя заслугі», юбілейнымі медалямі «65 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг.», «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Пераможца рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2008» у намінацыі «За высокі прафесіяналізм».



ШЭРШАНЬ
Пётр Пятровіч

Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы
і мясцоваму самакіраванню
Выбраны ад Віцебскай вобласці

Нарадзіўся 15 ліпеня 1949 года ў вёсцы Навасады Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыў Беларускую ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчую акадэмію, вучоны-аграном; Мінскую вышэйшую партыйную школу, палітолаг.

Працоўную дзейнасць пачаў слесарам Жалудоцкага рамзавода «Сельгастэхніка». Быў галоўным аграномам калгаса «Салют», старшынёй калгаса «Пражэктар» Лепельскага раёна Віцебскай вобласці. Службу у радах Узброеных Сіл. Працаваў старшынёй калгаса «Пражэктар», начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі, намеснікам старшыні Лепельскага райвыканкама, старшынёй Гарадоцкага райвыканкама, першым сакратаром Браслаўскага райкама КПБ, загадчыкам аддзела паліва, начальнікам вытворчага ўпраўлення па паліву Віцебскага аблвыканкама, генеральным дырэктарам Віцебскага абласнога прадпрыемства па паліву «Віцебскпаліва», генеральным дырэктарам Віцебскага абласнога прадпрыемства газавай гаспадаркі «Віцебскаблгаз».

Генеральны дырэктар вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Віцебскаблгаз».

Выбіраўся членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Член Камісіі Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і ліквідацыі наступстваў аварый, член дэлегацыі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у парламенцкай структуры Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывы.

Удастоены званняў «Ганаровы грамадзянін Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці», «Ганаровы грамадзянін Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці».

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», пяццю юбілейнымі медалямі, медалём «За супрацоўніцтва» (Саюзная дзяржава), Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.



ЯКАБСОН
Аляксандр Серафімавіч

Член Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню (2008 — 2010)

Выбраны ад Гомельскай вобласці

Нарадзіўся 18 красавіка 1951 года ў горадзе Гомелі. Закончыў Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, інжынер-будаўнік; Інстытут паліталогіі і сацыяльнага кіравання КПБ, палітолаг.

Працоўную дзейнасць пачаў будаўнічым майстрам трэста «Кандалакштрансбуд» у горадзе Кандалакша Мурманскай вобласці РСФСР. Служыў у радах Узброеных Сіл. Працаваў будаўнічым майстрам трэста № 10 Міністэрства прамысловага будаўніцтва Беларускай ССР, прарабам, старшым прарабам, галоўным інжынерам спецыялізаванага будаўнічага ўпраўлення № 214 аб'яднання «Гомельпрамбуд», інструктарам аддзела будаўніцтва Гомельскага абкама КПБ, старшынёй выканкама Светлагорскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, старшынёй Светлагорскага гарвыканкама, першым намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама, старшынёй Гомельскага гарвыканкама, старшынёй Гомельскага аблвыканкама.

Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага і трынаццатага скліканняў. Быў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага склікання, членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога і трэцяга скліканняў.

Удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Светлагорска».

